
В.ХУРСІК



КРОЎ І ПОПЕЛ ДРАЖКНА



DRAZNO

Памяці аднакласнікаў маіх
Святланы Міхадзюк
Леаніда Невяроўскага
Мікалая Дубіка
Мікалая Паходава
Генадзя Гурына

Віктар ХУРСІК

КРОЎ І ПОПЕЛ ДРАЖКНА

Гісторыя партызанскага злачынства

Выданне другое,
дапрацаванае і дапоўненае

Мінск
Выдавец В.Хурсік
2006

УДК 94(476.1)
ББК 63.3(4 Беи)
Х98

У кнізе выкарыстаны дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ)

Аўтар выказвае падзяку тым невядомым спецыялістам, якія па заданню дзяржаўных органаў правялі закрытае рэцэнзаванне першага выдання кнігі і прыйшлі да высновы аб адпаведнасці яе зместу фактычным абставінам спалення вёскі Дражна

Хурсік В. У.

Х98 Кроў і попел Дражна.: Гіст. партызанскага злачынства.—2-е выд., дапрац. і дап./В. У. Хурсік.—Мн.:Выд.В.Хурсік, 2006.—116 с., іл.

ISBN 985-6718-26-0

Дакументы друкуюцца з захаваннем правапісу арыгінала.

На вокладцы: сведка спалення Дражна Ліма Антонаўна Ралько. Май 2005 год.

На другой старонцы: малалетні вязень фашысцкага канцлагера Мікалай Іванавіч Пятроўскі ля магілы маці, сястры і брата, забітых партызанамі 15.04.43 г. Вёска Дражна. Сакавік. 2003 год.

© Хурсік В., 2003
© Хурсік В., дапрацоўка, данаўненні, 2006

ISBN 985-6718-26-0

Будзем помніць!

У перыяд другой сусветнай вайны тэрыторыя Беларусі была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Беларусы аказаліся перад выбарам: здацца на міласць акупантаў, ці змагацца. З гэтай прычыны адны пайшлі ў паліцаі, што дзейнічалі ў хаўрусе з немцамі, другія — у партызаны. У выніку жорсткай, бязлітаснай узброенай барацьбы паміж імі часам гінула і мірнае насельніцтва.

Па большасці мы ведаем пра страты нашага народа ад акупантаў і іх прыхільнікаў і амаль нічога не ведаем пра тое, як забівалі мірных грамадзян партызаны. Такіх выпадкаў, зразумела, было не вельмі шмат. Але яны былі. Таму для гісторыі і ўпамяць загінуўшых належыць пра гэта пісаць. Тым больш што дасюль, праз шэсць дзесяткаў гадоў пасля вызвалення, робяцца спробы замоўчваць ці, як гэта ўбачыць чытач, скажаць гістарычныя факты.

Разбіраючы абставіны спалення вёскі Дражна, я ніякім разам не хацеў кінуць цень на партызан, якія змагаліся ў 2-й Мінскай партызанскай брыгадзе адважна.

Спрычыніўшыся
сваім аповедам-даследаваннем
да падзей таго чорнага дня, схіляю нізка
галаву перад памяццю бязвінна забітых.

Аўтар

Homo tyties myritur quyties
*amittit suos**

У вёскі Дражна, што ляжыць на разлогах Старадарожчыны, чатыры канцы. Глянуць з самалёта — крыж. То не Бог, а самі людзі стварылі такія абрысы. Яшчэ да рэвалюцыі 1917 года ўтварылі яны адзін з канцоў гэтага крыжа, назваўшы яго Засценкам.

Засценак — вуліца з радам дамоў абапал яе. Кажуць, да рэвалюцыіі зямлю пад гэтыя дамы купіла прышлая шляхта. Ну, а раз купіла — значыць, была багацейшая за тутэйшых, якія з-за беднасці дазволіць сабе гэтага не маглі. Як складваліся адносіны паміж багацейшымі і бяднейшымі ў той час вядома: апошнія хавалі крыўду і, па магчымасці, шкодзілі навасёлам. Тым больш што дамы свае шляхта пабудавала з любоў'ю і размахам: з фігурнай ліштвой, фарбаванымі аканіцамі і белеными комінамі. У сядзібах

DRAZNO

Чалавек памірае столькі разоў, колькі разоў ён страчвае блізкіх.* ***Публій Сір.*

на новай вуліцы двары былі чыстымі, гаспадарчыя пабудовы знаходзіліся ў аддаленні, скаціна была пародзістай, людзі — чыста апранутымі, працавітымі і вясёлымі. Тое, што кіпела ў зайдросных душах іншых дражненцаў, вылілася вонку пасля рэвалюцыі. Засценку негалосна былі вызначаны асобныя сцяжыны для прагону быдла і паша для яе выпасу. Засценкаўскія хлопцы, як правіла, былі бітыя пры пераходзе ў іншыя раёны вёскі. Адчувальнымі былі і іншыя праявы дыскрымінацыі па маёмаснай прыкмеце. Урэшце ў 1929-м бяднейшыя расставілі кропкі над "і", раскулачылі багацейшых. Але гэта не змяніла бег жыцця некалі заможнай часткі насельніцтва Дражна. Жыхары Засценка па-ранейшаму гнулі спіну з ранку да прыцемку, праўда, цяпер ужо на калгасных палетках. Аднак не забываліся і пра ўласны падворак, мелі гонар і час для адпачынку.

Жыццё не стаяла на месцы. Моладзь, народжаная пасля рэвалюцыі, пакрысе успрымала каштоўнасці сацыялізму. У асноўным адкрыта не выступалі супраць новага ладу і дарослыя. Дзяды іх былі не з заможных, зямлю яны набылі колісь за апошнія капейкі, таму асабліваї злосці і крыўды на новую уладу не мелі. Некаторыя з засценкаўцаў уступілі ў камуністычную партыю. А Іван Аляксеевіч Пятроўскі нават пачаў загадваць Дражненскім спажыўсаюзам. Клопатная і адказная праца адбірала ў яго шмат часу і ўсю хатнюю гаспадарку правіла любая жонка — Алеся Пятроўна. На руках у яе было пяцёра дзяцей.

Іван Аляксеевіч працаваў шчыра і, як камуніст, імкнуўся выхоўваць у высокім патрыятызме сваіх дзяцей. Дачка Кацярына, якой напярэдадні вайны споўнілася дзевятнаццаць, працавала піянерважатай у суседніх Ляўках. Чатыры браты таксама ў патрыятызме ад яе не адставалі.

Вайна пачалася знянацку. Куды бегчы, што рабіць — ніхто не ведаў. Знайсці адказных работнікаў раёна было немагчыма. Пакуль у Дражна высвятлялі, што рабіць, прыйшлі немцы. Усё разам змянілася. З'явіліся лістоўкі з прапановай выкрываць камуністаў і камсамольцаў, а расстрэлы, спаленні і шыбеніцы, якімі поўнілася наваколле, ураз далі зразумець: навала прыйшла надоўга, з ёй не жартуюць. З прыходам немцаў папавыпаўзала на свет нелюдзь-навалач, якая нешта вышуквала, вынюхвала, пужала.

Іван Пятроўскі адчуў небяспеку і палічыў за лепшае пайсці з дому. Прыходзіў да родных толькі па начах, неўпрыкмет. То ў сяброў у Ляўках, то ў дражненскай радні начавала і Кацярына (яе знаходжанне ў камсамоле ўраз магло прывесці да гібелі сям'і).

У вакольных лясах партызан не было, але Пятроўскі ўжо знаходзіўся там са старшынёй калгаса Каўцяком, ветэрынарным урачом Шаплыкам і нейкім вайсковым афіцэрам. Відавочна, трагічнасць сітуацыі, у якой за лічаныя дні апынулася краіна, была не да канца імі ўсвядомлена, пачуццё небяспекі яшчэ не выпрацавалася. Аднойчы на ўскрайку леса па дарозе з Вялікага Бора ў Дражна ўсе трое трапілі ў засаду. Каўцюк

быў забіты на месцы, афіцэр захоплены ў палон. Толькі Івану Аляксеевічу ўдалося ўцячы. Праўда, ненадоўга.

Была позняя восень калі ноччу ў хаце Пятроўскіх пачуўся звон разбітага шкла і ў хату ўварваліся паліцэйскія. Алеся Пятроўна і дзеці схапіліся з ложкаў. Адзін з сыноў, Валодзя, памкнуўся ў сенцы, але яго спасціг удар прыкладам па галаве. Хлопец асеў. Прайшло хвілін пятнаццаць-дваццаць, і ў хату прывялі бацьку, у якога быў акрываўлены твар: паліцэйскія чакалі яго ў засадзе. Праз некалькі хвілін Івана Аляксеевіча з заламанымі рукамі вывялі. Астатніх Пятроўскіх у споднім пад канвоем адвялі ў калгаснае гумно.

У гумне гаспадарыў вецер, была калатнеча. Дзеці і сама Алеся Пятроўна дрыжалі. Каб не мякіна-труха ў кутце, пэўна б сканалі ад пераахаладжэння, а так зашыліся ў яе і пачалі чакаць ранку. Яшчэ не днела, калі рыпнулі дзверы, і волакам прыцягнулі і кінулі на падлогу іх бацьку. Ён быў збіты, стагнаў. Сказаў толькі, што дапытваліся пра партызан, прымусілі капаць магілу, ставілі на расстрэл.

Калі добра развіднела, у гумно завіталі паліцаі і немец. Алеся Пятроўна з маленнем у вачах сказала ім, што дзеці замярзаюць: "Пашкадуйце... Гляньце, яны ж сінія ўжо". Паліцай ашчэрыўся: "Не бядуй, нядоўга засталося..." Немец жа, падумаўшы, загадаў ісці за ім. Сям'ю Пятроўскіх прывялі на кармакухню, дзе рыхтаваўся корм для колішняга калгаснага быдла. Тут было цяплей.

Бліжэй да абеду дзецям пачаў дакучаць голад, аднак паліцаяў, якія ахоўвалі арыштантаў, гэта не турбавала. Гадзіны ў дзве дня з дазволу немца яны пайшлі харчавацца. Калі ж немец застаўся з арыштаванымі сам-насам, то адліў з свайго кацялка супу і падаў дзецям. Ён, відаць, быў няўпэўнены ў правільнасці свайго ўчынку, бо раз-пораз пазіраў у акно. Ды дзеці, галодныя, напужаныя, елі прагна і праз лічаныя хвіліны на іх сталаванне нічога не паказвала. У кармакухні акрамя Пятроўскіх знаходзіўся яшчэ той самы арыштаваны афіцэр, што быў з бацькам у лесе, і маладзенькі салдацік. Відаць, ён адстаў ад сваіх падчас нямецкага наступлення, блукаў па незнаёмым наваколлі пакуль не трапіў у рукі ворага. Ад страху, холаду і голаду салдацік калаціўся. "Есці хочацца",— сказаў вельмі ціха. Аднак паліцай, што знаходзіўся ў памяшканні, краем вуха пачуў гэтыя словы. Ён моўчкі выйшаў і вярнуўся назад з немцам. Таўстаморды высачэзны бамбіза ў касцы і з бляхай на грудзях падышоў да салдаціка, рэзка адкрыў вісеўшы ў яго на рамні патранташ. Дзіва, але там сапраўды аказалася абойма з пяццю патронамі. Малады баец, відаць, не надаў значэння свайму ўзбраенню і своечасова не знішчыў доказ. "Essen?"— і немец з усяго размаху ўдарыў салдаціка ў сківіцу гэтай абоймай, Патроны прайшлі навылет, хлынула кроў. Бедачына завыў, упаў на зямлю і скурчыўся ад болю. Прайшло гадзіны з тры, пакуль яго не выцягнулі і не расстралялі ля гумна, у той самай магіле,

якую капаў сабе Іван Пятроўскі. Дзеці з жахам назіралі за трагічнай развязкаі.

Пакрысе першы дзень зняволення падыходзіў да канца. Вечарэла. Фашысты замкнулі кармакухню, пакінулі ля яе вартавога і пайшлі ў вёску. Арыштаваны афіцэр сядзеў ціха, нічым не выдаваючы сваёй прысутнасці. Толькі глядзеў, як за акном туды-сюды праходжваўся немец-вартавы. Калі добра сцямнела, чырвоны камандзір паспрабаваў вызваліцца. Ён устаў і з разбегу кінуўся ў акно кармакухні. Лёгкая рама вылецела разам са шклом, і афіцэр абрушыўся прама на вартавога. Пачалася барацьба, пачуўся стрэл, потым у неба ўзляцела ракета. Якую памылку дапусціў уцякач невядома, але адразу немца яму забіць не ўдалося. На дапамогу вартавому з вёскі кінуліся паліцаі. Нядаўні вязень пачаў адбягаць да лесу і адстрэльвацца з захопленай вінтоўкі, але ў цемры, з-за вялікага хвалявання, у паліцаяў, што несліся на конях, пацэліць было немагчыма. Стрэлы толькі раздражнялі іх. Героя ўзялі ў кальцо, але нават пасля таго, як патроны скончыліся, ён працягваў змагацца за сваё жыццё: кідаў у коней камяні, адыходзячы да лесу. Толькі стрэл спыніў яго...

Пасля гэтага выпадку Пятроўскіх адпусцілі, і яны вярнуліся ў сваю хату. У цемені сяк-так уставілі вокны, пратапілі печку. Сон не ішоў. З трывогай згадвалі падзеі дня, думалі, дзе б мог быць бацька.

Колькі дзён і месяцаў жылі не выходзячы на вуліцу. Гаспадара па-ранейшаму не было. Алеся Пятроўна хадзіла да начальніка

паліцыі, каб хоць нешта дазнацца пра лёс мужа, але паліцыянт толькі вымагаў яйкі і нічога канкрэтнага не казаў. У Валодзі, сына, пасля ўдару прыкладам пачаліся эпілепсічныя прыпадкі. Хлопец пакутаваў. Кацярына ўсё хавалася ў знаёмых. Пачалося цяжкае, поўнае няпэўнасці і трывогі жыццё.

Сын Алесі і Івана Пятроўскіх Мікалай Іванавіч Пятроўскі ўспамінае*:

"Нягледзячы на перадваенныя крыўды, гуртам засценкаўцы ў паліцыю не падаліся. Аказаўся ў нямецкіх паслугачах Мікіта Субцэльны. Яго бацьку Васіля раскулачылі, і сын не надта вагаўся ў прыняцці новага парадку. Апынуўся там і Ягор Раманавіч Колас, і мясцовы жыхар з дзіўным прозвішчам Сапляк.

Паліцэйскі гарнізон знаходзіўся ў Дражна выключна таму, што вёска знаходзіцца на скрыжаванні дарог і займае, у ваенных адносінах, выгаднае геаграфічнае становішча. Яна размешчана на невялікім узвышшы, лес ад яе знаходзіцца на адлегласці двух-трох кіламетраў. Вёска вялікая, калі б паліцаям прыйшлося абараняцца ў іх была магчымасць манеўра, кожная хата магла служыць агнявой кропкай. На самым высокім месцы, у цэнтры ля школы, паліцаі пабудавалі дзоты. Адтуль усё наваколле было відаць, як на далоні. Гарнізон складаўся з 78 паліцаяў. Дражна ў ваенных адносінах была моцным арэшкам. На працягу доўгага часу адкрыта на гарнізон партызаны не нападалі.

Першая такая спроба адбылася ў студзені 1943 года. Мы, малыя, сядзелі дома, калі

**Дыктафонны запіс зроблены 23 лютага 2003 года.*

пачалася страляніна. Летам, канешне ж, ірванулі б за ганак, каб пабачыць бой на свае вочы, а зімой куды выскачыш, калі вёска ў сумётах, а абуць няма чаго. Стралялі з дзотаў у бок дарогі з Вялікага Бора. Так сказала пазней маці. Да змяркання стала вядома, што група партызан зрабіла спробу з боем узяць вёску, але была знішчана. Падзея была абмеркавана сярод вяскоўцаў. Вывад быў аднадушны: партызаны — не мясцовыя, інакш не штурмавалі б дзоты па снезе ў голым полі. Высветлілася, што некаторым з іх удалося ўсё ж трапіць на ўскрай вёскі, але моцным кулямётным агнём яны аказаліся адсечанымі ад дарогі, па якой прыйшлі. У выніку партызаны апынуліся ў пастцы. У іх не было іншага выйсця, як прадоўжыць наступленне на цэнтр вёскі. Але ў выніку ўсе былі знішчаны агнём з дзотаў".

Далей Мікалай Іванавіч расказаў, што гарнізон можна было б узяць з самымі малымі стратамі, калі б партызаны пераапрануліся ў нямецкую форму. Такім чынам яны б атрымалі непасрэдны доступ да тых самых дзотаў.

Колькі партызан загінула ў тым баі сказаць цяжка. На безыменным абеліску ля вёскі адзначана, што дваццаць, але наўрад ці гэтаму можна верыць, аб чым будзе сказана ніжэй. Адзін партызан быў забіты сваімі. Нябожчыка знайшлі паліцаі, што прачэсвалі лес пасля бою.


Тады, у студзені, ніводны паліцай не пацярпеў. Жыхары Дражна, прымушаныя немцамі сцягваць і хаваць забітых партызан, не ведалі яшчэ, што неўзабаве будуць хаваць на могілках і сваіх родных.

Мікалай Іванавіч Пятроўскі працягвае ўспамінаць:

"Ранкам у 43-м годзе (я дакладна дзень не памятаю-та). Пішуць 14-15-га, а ў кнізе "Памяць" — у ліпені месяцы. Так. Тут нейкая фальсіфікацыя. Так. Але ведаю, што было гэта 13-га ці 14-га (гэта мне ўжо падказалі жыхары, што засталіся жывымі). Дык вось ранкам 13 ці 14 красавіка не памятую, як я выскачыў. Усё гарэла... Ужо гарэла... Стралялі. Гарэла ўсё. Вось. Маці нас вывела. Напэўна вывела з хаты. Мы адразу (гарыць жа ўсё) — на поле. На ўчастак. На свой прысядзібны ўчастак. Два браты малодшыя пабеглі па канаве (раней былі гэтыя асушальныя канавы) і папаўзлі далей, да дзядзькі. А я, сястра і маці — засталіся. Так. І вось я выпаўз на прысядзібны ўчастак, бачу гарыць усё буквальна. Сястра побач са мной ляжала. Яна не разлучалася з камсамольскім білетам, які быў зашыты ў яе паліто, і партыйным бацькі. А я, як гаворыцца, выскачыў у чым маці нарадзіла. А марозік быў. І вось выскачылі — гарыць усё. Не мог уцяміць адразу, лёг побач з сястрой ніц. Потым думаю: павярнуся, паглядж у, дзе маці? Павярнуўся. Гляджу — над ёй, як крумкачы над трупам... Там і жанчыны былі, і мужыкі былі. Кожны імкнуўся нанесці ёй... Яна ўжо акрываўленая была. Я паглядзеў і да сястры: "Каця! Маму забілі, замучылі маму!" І яна [Каця] прыпаднялася ў гэты момант. Маці... Усё, уся ў крыві, страшна... Глядзець страшна... "Каця!—зноў крычу.—Глядзі, перарэзалі горла... Нават усю штыкамі



Сучасны дражненскі Засценак.
Стрэлка паказвае на месца, дзе да красавіка
1943-га года знаходзілася хата Пятроўскіх.
Сакавік 2003 года.



Падыход да вёскі Дражна з боку дарогі з Вялікага Бору.
Адсюль спрабавалі партызаны штурмаваць вёску
ў студзені 1943-га года.
Стрэлка паказвае на месца размяшчэння
паліцэйскіх дзотаў.
Сакавік 2003 года.

пакалолі...” Страшна... Яна [Каця] толькі паднялася і бачу: усё — раз і ўпала. А я заўважыў (побач плот яшчэ не гарэў): стаяў салідны мужык у скураных ботах. Мне і зараз гавораць, што гэта быў Варыв...нчык. Я яго бачыў. І ён чакаў. Ён відавочна хацеў, каб сведкаў не засталося. Разумееце. У яго, па-мойму, дзесяцізарадная вінтоўка такая была. Я паглядзеў: бачу — яна прыпаднялася і ўсё — паліто крывёю набрыняла. Я крычу: “Каця! Каця!“ І мне ўжо не страшна. Я настолькі быў азвярэлы ад такога страшнага здзеку. І вось што, значыць: гляджу — а падняць яе я ўжо не магу.

— А што гэта за Варыв...нчык быў?

— Варыв...нчык. Вы ведаеце быў вось гэты... Не ведаю, хто мне падказаў, ці то душа, ці то хтосьці мне падказаў. Я ж многа гадоў яго... Кажуць, ён памёр ужо...

— Ён камандзірам быў?

— Не, ён не камандзірам быў... Камандзірам там Лапідус быў, гэта дакладна...

— Добра, вернемся.

— У мяне ўжо не было страху. Я бачыў закатаваную маці, сястру застрэленую. Я папоўз, папоўз яшчэ і па дарозе глядзеў, як Субцэльных... (наш дом побач). Я не ведаю, як звалі іх маці... Дык бачыў, як гэту маці схапілі з дзіцем. Яна малодшае дзіця, пэўна дзяўчынку, абхапіла. Ну ясна, маці самае малодшае, самае дарагое беражэ. І вось яны — гарыць усё — схапілі яе і прама ў гэты агонь, у палаючы дом кінулі. А колькі там дзяцей было... У іх многа дзяцей было... Бацька іх, галава сям’і, да вайны памёр,

DRAZNO

хворым на сухоты быў. Яны ж не мелі дачынення ні да якай паліцыі... Далей гляджу Грыневічы...

— А што Вам ніхто не рабіў пераслед?

— Ды яны пайшлі далей! Палілі і забівалі, палілі і забівалі! — гэта была іх адзіная мэта. Яны вось да гарнізона гэты ўчастак у вёсцы спалілі і пайшлі.

— А што гарнізон маўчаў у гэты час?

— Ды я не звяртаў увагі: стралялі, не стралялі? Безумоўна, канешне, была страляніна. Я ж дзіцё ў тыя разборкі не лез, ды і не да таго было: нам жа ўтварылі горш Хатыні, спалілі ўсё. Паверыце, а я ж заўсёды верыў Савецкай уладзе, верыў, таму што бацька нас такімі выхаваў...

— Ну а паліцэйскія, засталіся яны жывымі?

— Так, паліцыя засталася.

— Яны не прыходзілі паглядзець на пажарышча?

— А навошта ім глядзець — партызаны ж пазабівалі! Дарэчы, калі сястру расстраляў Варыв...нчык (я быў у яго,.. памёр...) паліцаі пазней прыйшлі. Сястра ляжала ў паліто. Яна з ім не расставалася, бо ў ім былі зашыты партыйны білет бацькі і яе камсамольскі. Куля якраз у тым месцы прайшла, дзе яны былі зашыты, і разарвала іх. Ну дык паліцай і кажа: "Сабаку сабачая смерць". Гэта сказаў паліцай. І яны лічылі, што ўсё правільна зроблена.

У той дзень партызаны забілі і яшчэ аднаго адданага Савецкай уладзе чалавека Паўла Паўлавіча Коласа. Сын яго, франтавік, прайшоў усю вайну, не ведаючы ад чыіх рук загінуў бацька".

Пасля сустрэчы і размовы з Мікалаем Іванавічам на яго кватэры ў Мінску было вырашана выехаць на месца трагедыі ў Дражна.

22 сакавіка 2003 года ён, яго пляменнік колішні жыхар Засценка, арганізатар энергабудаўніцтва краіны, а зараз пенсія-нер Міхаіл Уладзіміравіч Шамко і аўтар гэтых радкоў выехалі з Мінска ў Дражна. Міхаіл Уладзіміравіч сядзеў за рулём сваіх "Жыгулёў" і цешыў нас выдатнымі аповедамі пра мінулае нашай электраэнергетыкі і свайго багатага на падзеі жыцця. Мы выбралі не самы блізкі шлях — праз Асіповічы. Аднак за размовай час праляцеў хутка, і за гранічнай вёскай двух раёнаў Вялікі Бор суразмоўцы суцішыліся: з ваколіц Вялікага Бора некалі пачыналіся партызанскія рэйды на Дражна.

Пры пад'ездзе да Дражна спыніліся ля невялікага мемарыяла, дзе, як мяркуецца, пахаваны партызаны, якія загінулі ў баі 15.01.1943 года. На гранітнай пліце ніводнага прозвішча. Рушылі да вясковых могілак (іх тут называюць шляхецкімі ці Засценкаўскімі). На іх хавалі каталікоў, што некалі да рэвалюцыі купілі зямлю ў вёсцы. Ёсць там і нядаўнія магілы.

Могілкі ў запусценні.* Мае спадарожнікі паказваюць, дзе пахаваны ахвяры трагічнага дня 15.04.1943 года. Яны ў розных кутках, на многіх помніках надпісы ўжо ледзьве можна прачытаць. "Ведаеце,— засмучана гаворыць Мікалай Іванавіч,— на некаторых магілах былі драўляныя крыжы, дзе ж іх цяпер адшукаеш!?"

У 2003 годзе могілкі не былі агароджаны (В.Х.**).*

Спадарожнікі паказваюць рукой у бок вёскі: "Бачыце школу? Там у час вайны былі паліцэйскія дзоты. Ці ж можна пад іх агнём пераадолець такую прастору!" І сапраўды, з кіламетр набярэцца пад горку (па чысцюткім полі). Пазней я раблю фотазды-мак з кропкі, дзе паліцэйскі кулямёт адсек партызан пры першым штурме Дражна. Чытач сам можа ўпэўніцца, што ўзяць штурмам тыя дзоты без значных страт было немагчыма. Міхаіл Уладзіміравіч як сапраўдны гід расказвае пра мясцовую тапаніміку. Высвятляецца, што Дражна складаецца з *Сяла, Замасточча, Дварышча, Валачаеўкі, Савецкай, Прычапілаўкі*, вуліцы з дзіўнаю назвай *Качан і Засценка*. Таго самага Засценка, што і быў спалены партызанамі ў 1943-м. Мы ідзём па вуліцы, суразмоўцы называюць прозвішчы забітых, спаленых, закатаваных...

Заходзім у хату Мілы Панасевіч. Адчуваецца напружанасць. Гаспадыня бянтэжыцца: "...Што зноўку паўтараць?" Аказваецца, ужо нехта заязджаў сюды, нешта запісваў, ды тое не пабачыла свет. Прыходзіць суседка Ліма Ралько і муж гаспадыні дзядзька Валодзя. Яны перадаюць складзеныя вяскоўцамі спісы жыхароў, забітых і страціўшых жытло ў час карнай акцыі партызан у красавіку 1943 года.

Мы, прыезджыя, сядаем на канапу. Я ўключаю дыктафон. Слова за словам жанчыны пачынаюць сумны аповед, рукі іх трасуцца, вочы поўняцца слязамі... Адзінае пытанне: "За што нас тады?.."

Лімы Антонаўны Ралько і
Мілы (Людмілы) Аляксандраўны Панасевіч

Ліма Ралько:

— Казановых жа тожа ўсіх забілі: і маці, і дзяцей.

Аўтар:

— Субцэльных?

Ліма Ралько:

— Так, гэта мянушка іх Казаны была. Іздзяваліся. Я гавару, я ніколі цяперака жыда не хачу шкадаваць...

Аўтар:

— Чаму Вы кажаце, што гэта былі яўрэі? Мо, гэта былі армяне?

Ліма Ралько:

— А ліха іх ведае... Усякія, усякія былі... Вой, вой, вой... Вот ля гумна — Лявона, потым Вінцэся, Таню забілі... Бойня была.

Міла Панасевіч:

— Вот як на Новы год быў, дык мама кажа: «Дзеці, не пужайцеся — бой». Так. А вот як гэты бой пачаўся, дык я нешта і не знаю.

Аўтар:

— Дык, мо, і не было бою, хто ў каго страляў?


Міла Панасевіч:

— Знаеце, як у вайну: пачуеш стрэл — ужо і бой.

DRAZNO

СВЕДКА
WITNESS FOR THE PROSECUTION

РАЛЬКО Ліма Антонаўна
(1926-2005)



СВЕДКА
WITNESS FOR THE PROSECUTION

ПАНАСЕВІЧ
Людміла (Міла) Аляксандраўна
1927 г.нар.



Аўтар:

— Раскажыце пра гэты дзень.

Міла Панасевіч:

— Калі было? — 13 апрэля сорак трэцяга года. Гэта было тыдзень пасля Благавешчання. Вот свята Благавешчання сядзьмога чысла. Так. Валя наша, сястра мая, яшчэ кросны, ткала ў хаце. Вот усё стараліся парабіць, Вялікадне хутка было. Тут па-суседству жыла яшчэ (нашыя родственнікі) Броня ўчыцельніца. Мужык на фронце яе быў і брат. А маці — Тэкля была. І, значыцца, і ўнучак Валерка.

Аўтар:

— Як яе прозвішча?

Міла Панасевіч:

— Тожа Шамко, а па мужу Леановіч. І вот гэта Броня прыдзе: «Дзядзя Аляксандр, давайце рабіць доты, бо паліцэйскія ўсе парабілі доты,— кажа, — а ў нас дотаў няма. Няхай пачнецца бойня — не будзе куды хавацца». А тады кажа: «Хіба гэта немцы? Гэта ж свае людзі, папытаюцца,— кажа,— мы атвецім. Ды й і ўсё». Ага. І тут яшчэ бой пачаўся. Вядома, няма сваёй ямы — бегаем. А тут па-суседству жыў Паўлюк Коласаў. Так. Ён выкапаў. Там у яго сірэнь расла на гародзе. Каля таго куста выкапаў яму, можа, ён закапваць якое зярно хацеў, можа, ён адзёжу якую хацеў... І мы ў тую яму пабеглі: сястра Валя, брат Коля і я. А тата, мама і баба засталіся тут, можа, выносіць якую адзёжу яшчэ з хаты (усе ж у хаце было). Ага. І тут бежанцы жылі: от между нас і Паўлюком Коласам. Бежанцы жылі смаленскія. Ага. І тыя бежанцы туда пабеглі. Тут

ужэ наляцелі этыя партызаны і крычаць: «Бей фашыстаў, не шчадзя ні старога ні малога!» А той Паўлюк Коласаў самастаяцельны мужчына, яшчэ ж ні стары, нічога, сама ў сярэдніх гадах, падняў рукі, кажа: «Таварышы! Мы — вольныя, вольныя!» Яны — трах! трах! значыцца, у тую яму і эта — таго й Паўлюка забілі. Я крычу на Валю: «Валя, і Колю забілі! (брата майго, так), — І яшчэ нас расстраляюць!» Ой... А тады Валю забілі, сястру маю. Я раненая асталась. «А, Валечка, мяне ранілі, ж», — я ёй сказала. Яна кажа: «Дай, я цябе перавяжу». Ды ўжо не ўспела. Ну, бой ідзе, значыцца, усё страляюць. Мы ўжо сядзім там, хто жывы. Патом ужэ гавораць: «Вылазьце, хто жывы, із ямы!» Я не маю прадстаўлення ці мяне хто вывеў, ці мяне хто вынес, — і мы паляглі на полі. Так. Тыя... (бежанка была — эта Шурына маці мы называлі). Бежанка. Так. Ванька быў Сенін брат. От. Тыя бежанцы паляглі, не знаю яшчэ хто. Тут ужо пачалі адступаць этыя ўжэ парцізаны. Так. Дык ізноў: трах! трах! — страляюць. Тыя паднялі рукі, крычаць: «Мы — бежанцы, мы — бежанцы!» Іх жа і па разгавору пазнаеш, што яны, значыцца, не беларускія. Аґа. І тут забілі тую бабушку, забілі таго Ваньку-бежанца і сарвалі яшчэ сапагі ў таго Ванькі. Вот і ўсё. Я ляжу... ляжу, тако руку падлажыўшы. А патом мама бяжыць ужэ крычачы. Ну і што я больша скажу? Усё...

Усё пагарэла. Усе хаты згарэлі. Адна хата засталася, во ў Лявона Коласа. Яго забілі. І туды ўжэ пазносілі: хто ранены, хто біты.

Пачалі зносіць у тую хату ўсіх. А патом машына прыехала ці то нямецкая, ці якая, ці паліцэйская, ці немцы? Прыехалі і забралі. У Дарогі нас павезлі. Мама крычыць: «Што рабіць? Вой, Божа ж, мой!» Ну, што ж: [адну] дачку забілі, сына забілі, мяне трэцюю ранілі, бабу забілі. Вот. Гаворыць: «Едзь, Сашка, чый голас яшчэ чуеш (на мяне кажа —«чый голас яшчэ чуеш»), а Валя нежывая і Коля нежывы». Ну і паехалі мы ў Дарогі ў той самы дзень. У бальніцу. Ну і вот Адам быў ранены, тока крычаў усё: «Спасайце мяне!» Ну ён і памёр. Соня Валесіна была ранена, но яна тожа жыва асталась...

Ліма Ралько:

— Яны пабілі-пабілі людзей і пайшлі (у каждым доме па тры-чатыры чалавекі). Гэты бок яны што-та баяліся. Вот. А Вінцэсь, як кінуў маму... і Таню, і сына Толю забілі, і Гардзея (гэта прэзідэнта Магілёўскай вобласці дзеда).

Падчас гэтай размовы сведкі перадалі аўтару складзеныя спісы ахвяр, якія змяшчаюцца на наступнай старонцы.

СПІС
мірных жыхароў вёскі Дражна, забітых партызанамі 13 красавіка 1943 года

(складзены ў сакавіку 2003 года жывымі сведкамі тых трагічных падзей)

1. Бежанец са Смаленшчыны — Іван
2. Бежанка са Смаленшчыны
3. Гейсік Алена Аляксееўна
4. Гейсік Елізавета Аляксееўна
5. Грыневіч Агаф'я Сямёнаўна
6. Грыневіч Анатоль Вінцэсавіч
7. Грыневіч Тэкля
8. Грыневіч Таня Сямёнаўна
9. Дражын Гардзей Ігнатавіч
10. Колас Лявон Мікалаевіч
11. Колас Павел Паўлавіч
12. Леановіч (Шамко) Браніслава Андрэеўна
13. Парахня Ніна Пятроўна
14. Пятроўская Алеся Пятроўна
15. Пятроўскі Іван Антонавіч
16. Пятроўская Кацярына Іванаўна
17. Пятроўскі Сцяпан
18. Пятроўскі Уладзімір Іванавіч
19. Субцэльны Адам Максімавіч
20. Субцэльная Кацярына Максімаўна
21. Субцэльная Фёкла
22. Шамко Валянціна Аляксандраўна
23. Шамко Марыя Іванаўна
24. Шамко Мікалай Аляксандравіч
25. Шамко Тэкля

Усяго 10 душ мужчын і 15 жанчын і дзяцей.

СПІС
будынкаў вёскі Дражна, спаленых партызанамі 13 красавіка 1943 года

(складзены ў сакавіку 2003 года жывымі сведкамі тых трагічных падзей)

Спалены хаты, дзе жылі:

1. Пятроўскі Іван
2. Субцэльны
3. Грыневіч
4. Дражына Палагея
5. Дражын Іван
6. Філіповіч Платон Сяргеевіч
7. Колас Раман Мікалаевіч
8. Колас Павел Паўлавіч
9. Шамко Аляксандр Андрэевіч
10. Шамко Тэкля
11. Шамко Уладзімір Андрэевіч
12. Грыневіч Алеся Сцяпанаўна
13. Пятроўскі Ігрось Сцяпанавіч
14. Раўтовіч Пётр
15. Раўтовіч Марыя
16. Шамко Аляксандр Іосіфавіч
17. Матусевіч Ганна Сямёнаўна
18. Парахня Пётр
19. Гейсік Алімпа
20. Шыбко Алеся Андрэеўна
21. Субцэльны Іван
22. Субцэльны Аляксей
23. Жукоўскі Піліп
24. Жукоўскі Сцяпан
25. Шамко Антось Пятровіч
26. Шамко Іосіф Пятровіч
27. Пятроўская Ефрасіння
28. Пятроўскі Мікалай Аляксеевіч
29. Пятроўская Кацярына
30. Грыневіч Агапа Сямёнаўна
31. Пятроўскі Мікалай
32. Рэўтовіч Тэкля
33. .....
34. Пятроўскі Іван Сцяпанавіч
35. Грыневіч Вінцэсь Пятровіч
36. Дражын Гардзей
37. Кіжык Ксенія Паўлаўна

Былі таксама спалены школа і калгаснае гумно.

Вось якія аповеды давялося пачуць.

Потым мы селі да стала, пілі памінальную за бязвінных засценкаўскіх ахвяр, за ўсіх ахвяр той вайны, за гаротную мінулую і сучасную нашу Беларусь. Размова часам збівалася, адыходзіла ад асноўнай тэмы. Мае ўжо вельмі старэнькія суразмоўцы-сведкі прыпаміналі даваенную пару. Уразіў іх і нядаўні прыезд пана Міхайлоўскага ў вёску. Казалі: «Цяперашні пан — мэр Варшавы. Ён продак таго самага пана Міхайлоўскага, што некалі гаспадарыў у Дражна. Добры, светлай памяці, быў чалавек...»

Па дарозе назад у Мінск я запытаў у Мікалая Іванавіча, як закончыўся для яго той чорны дзень?

— Застаўся жывым дзядзька — брат маці — Шамко Антось Пятровіч, ён і прытуліў нас. У яго таксама ўсё згарэла, таму жылі ў зямлянцы. Маці, брата і сястру пахавалі на могілках (старэйшага брата Валодзю бандыты, калі адыходзілі, адвялі на паўкіламетра за вёску і расстралялі). Там жа на могілках пахавалі сваіх родных і іншыя вяскоўцы.

Пасля таго як Засценак быў спалены, невядома адкуль паліцэйскія прывезлі на пажарышча бацьку. Сказалі: "Зараз мы цябе расстраляем разам з тваімі падкідышамі". Што бацька быў камуністам і што яго дачка была камсамолкай, яны ўжо, безумоўна, ведалі. Ім важна было прадэманстраваць, што "новы парадак" прымаюць і камуністы, важна было зламаць чалавека, прымусіць выконваць іх волю.

— А дзе ж быў бацька ўвесь гэты час?

— Пасля арышту яго адвезлі спачатку ў Старыя Дарогі, а потым ён некалькі месяцаў сядзеў у бабруйскай турме. Мы аб ім у той час нічога не ведалі.

Бацька калі ўбачыў пажарышча быў нейкі час быў у разгубленасці. У гэты час яго і запісалі ў паліцаі. Аднак, без даверу. Зброю не далі, за домам сачылі, і мы аб гэтым ведалі. Мяркую, паліцыя лічыла, што рана ці позна бацька выйдзе на сувязь з партызанамі.

Прабыў ён у паліцыі з вясны да восені 1943 года і ўвесь гэты час пакутаваў ад неабходнасці хадзіць у паліцыю, вывучаў магчымасць зыходу ў лес, але зручнага моманту не было. Зазначу, бацька імкнуўся ў партызаны, не звяртаючы ўвагі на тое драпежніцтва, якое ўчыніла партызанская банда. Ён быў адданы партыйным ідэям, верыў бальшавікам.

Аднойчы, прыйшоўшы дамой прыцемкам ён усхвалявана загадаў нам, дзецям, хуценька збірацца. Мы з братам Сашам былі дома, трэцяга ж з нас — Лёні, не аказалася. Ён у гэты час быў ў вёсцы, аб чым мы не ведалі. Пашукалі-пашукалі навокал і вырашылі бегчы без яго: відаць, адкласці ўцёкі ў бацькі ўжо не было ніякай магчымасці. І сапраўды, як толькі мы пачалі аддаляцца ад вёскі пачалася страляніна, але ў начны лес за намі паліцаі не сунуліся.

Неўзабаве мы апынуліся ў партызанскай брыгадзе імя Кірава, зямлянкі якой знаходзіліся ля Зарэчнага. Камандаваў брыгадай бацькаў знаёмы Шуба. Нас прынялі добра. Пазней у атрадзе мы чулі ад бацькі, што

Засценак спаліў атрад Лапідуса, а ў карнай аперацыі ўдзельнічала шмат яўрэяў.

— А дзе ж дзеўся малодшы брат?

— Леанід, калі мы з бацькам беглі з вёскі, знаходзіўся ў нашага дзядзькі Антона. Дарагі наш дзядзька, на галаву якога звaліўся нечаканы клопат, задобрываў каменданта, яйкі яму насіў, каб пасля нашых уцёкаў жывым пакінуў пацана.


Мы ж колькі часу жылі ў атрадзе сям'ёй. Там таксама было несалодка: бруд, вошы, недахоп харчавання. Памятую, прынясе бацька прамерзлы акраец, грызём — толькі вушы трасуцца. Была спроба партызан адправіць нас на Вялікую зямлю з партызанскага аэрадрома ў Любанскім раёне. Дарослыя ўзялі нас і рушылі ў напрамку Любані, але група не здолела перайсці Слуцкую шашу, якая ахоўвалася немцамі вельмі пільна. Палажылі нас у нейкім балоце. Вярнуліся назад.

У 1944-м бацькі не стала. Ён загінуў зімой у баі ля вёскі Вуглы. Так і бадзяліся мы з братам непрыкаяныя па лагеры — чужыя, нікому непатрэбныя. Вырашылі вярнуцца дадому. Гэта было рызыкоўна, але мы былі дзеці і небяспеку адчувалі слаба. Зноўку пайшлі да дзядзькі Антона. Ён рабіў захады, каб нас не чапалі, але ў маі мяне паліцаі ўсё ж вылавілі. Я быў дастаўлены ў Старыя Дарогі і праз колькі дзён адпраўлены ў Германію ў канцлагер горада Уніген, што ля Штутгарта.

Пра працу ў фашысцкіх канцлагерах напісана шмат, і дадаць тут мала чаго можна: праца па 12 гадзін у дзень, баланда, збіенне



Забітая партызанамі 15.04.43 піянерважатая школы ў Ляўках Кацярына Іванаўна Пятроўская (зправа) з сяброўкай Чорнай. Перадваенны здымак.



Сыны Алесі Пятроўны Пятроўскай, забітай партызанамі 14.04.1943 г. (злева направа): Мікалай, Аляксандр, Леанід. Пасляваенныя здымкі.

за нязначныя правіннасці. У лагеры аказаліся і мае землякі: Антон Чарапок з Залужжа, Аляксандр Казлоў і Віктар Нямковіч з Зарэчнага. Аднойчы з апошнім збеглі з лагера ў пошуках ежы. Цудам засталіся тады жывымі.

Вызвалілі нас амерыканцы. Гэта было нечаканасцю, бо немцы загналі нас, вязняў канцлагера, у штольню. У закрытай яе прасторы паступова заканчвалася паветра, і мы б маглі задыхнуцца.

А потым — розныя праверкі і дарога дамоў. Паколькі бацькі мае загінулі, мяне накіравалі ў дзіцячы дом у Яраслаўскую вобласць. Браты Лёня і Саша апынуліся ў дзіцячым доме ў вёсцы Дараганава Асіповіцкага, тады Старадарожскага, раёна.

Пазней Лёня скончыў мараходку ў Клайпедзе, плаваў, вярнуўся на Беларусь, вучыўся. Апошнім часам ён працаваў галоўным энергетыкам на заводзе ацяпляльнага абсталявання ў Мінску. Зараз на пенсіі.

Саша скончыў ваеннае вучылішча. Служыў на Камчатцы. На жаль, жыццё яго трагічна абарвалася: загінуў у дарожна-транспартным здарэнні ў 1971 годзе.

Так выглядае трагедыя Дражна ў асобах і дзеях, запісаная са слоў яе жыхароў.

На наступных старонках падаецца "асвятленне" абставін трагедыі дражненскага Засценка ў афіцыйным друку.

Кніга «Памяць» Старадарожскага раёна Мінскай вобласці

(стар. 144)

Данясенне аб разгроме партызанамі 2-й Мінскай брыгады паліцэйскага гарнізона ў в. Дражна Старадарожскага раёна ў красавіку 1943 г.

Отряд им. Чапаева был расположен в дер. Межерище Гресского района. Численный состав — 200 чел., вооружение — винтовки, пулеметы. Командир отряда Пивоваров, комиссар Татур, нач. штаба Цветков.

2-я Минская бригада, в составе которой был тогда отряд им. Чапаева, была расположена в деревнях Стародорожского и Гресского районов. Противник имел густо разветвленную сеть своих гарнизонов, из которых по своей свирепости и расправе над мирным населением выделялся гарнизон, расположенный в Дражно — большом селе Стародорожского района. Гарнизон имел 400 полицейских и "добровольцев". Команда, как и в других гарнизонах, была безусловно немецкая. Штаб 2-й Минской бригады через свою агентуру узнал, что **минометы дражненского гарнизона вывезены в другой гарнизон***. Перед бригадой встала задача разгромить гарнизон в Дражно и уничтожить укрепленные точки гарнизона. 13 апреля 1943 г. командование бригады поставило перед отрядом им. Чапаева задачу двигаться в район

**Звернем увагу на гэту акалічнасць і параўнаем гэта сцвярджэнне з сцвярджэннем на стар. 401 справы 149 вопіса 1 фонда 3500 (НАРБ), дзе змешчана кароткая справаздача 2-й Мінскай партызанскай брыгады з 1.04 па 1.05 1943 года:*

«14-го апреля уничтожен гарнизон Дражно.

Уничтожено 232 полицейских.

взято трофей: миномётов — 3, пулемётов — 2, винтовок — 36, патрон —3000. Остальное оружие сгорело».

Справаздачу падпісаў камбрыг Іваноў.

Дражно. 14 апреля в 5.00 отряды бригады заняли исходные позиции с восточной стороны Дражно. 14 апреля в 5.00 отряды бригады заняли позиции согласно приказу штаба бригады. Отряд им Чапаева занял исходные позиции между дер. Залужье и дорогой, идущей из Дражно на северо-восток. Отряд им. Чапаева получил приказ громить дзоты* противника расположенные с восточной стороны гарнизона.

Бой длился 3 часа. Операции отряда им. Чапаева по уничтожению дзотов* протекали в тесном взаимодействии с другими отрядами бригады.

Отряд выполнил поставленную перед ним задачу: разгромил доты** и проник на улицы гарнизона. Ввиду того, что засевшие полицейские вели огонь из домов, были подожжены эти дома. В 9.00 по условленному сигналу (ракете) отряды бригады начали отход...

Сожжены здания, где находились полицейские, уничтожены в основном доты**... Потери отряда убитыми и ранеными — 13 чел. В этот день 14 апреля отряд подобрав раненых достиг своего расположения — дер. Межерище.

Командир бригады им. Чапаева*** ст. лейтенант Матевосян.

Нач. штаба бригады капитан Цветков.

По книге:

Всенародное партизанское движение в Беларуси в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1978. Т. 2. Кн. 1. С. 590—591.

---

*Пазначаныя зорачкамі * і ** абарончыя умацаванні значна адрозніваюцца паміж сабой як па прызначэнню, так і па канструкцыі. Аднак у артыкуле яны падаюцца як адно і тое ж.*

****Ст. лейтэнант Матэвасян і капітан Цвяткоў пададзены як кіраўнікі брыгады імя Чапаева. Чаму не кіраўніцтва **атрада** імя Чапаева, які ўдзельнічаў у «штурме» Дражна, а створанай пазней **брыгады** імя Чапаева даносіла аб аперацыі, невядома.*

Газета "Советская Белоруссия"

№№ 287—288 за 18 лістапада 2000 года:

Артыкул Эмануіла Іофе "Отряд из легенды"

"В июле этого года, выступая на открытии мемориала "Яма" в Минске, Президент А.Г. Лукашенко сказал: "Когда сами евреи говорят о миллионах погибших соплеменников, они нередко забывают о том, что евреи сопротивлялись, боролись. Они не шли смиренно, чтобы положить голову на плаху. Наша Беларусь стала единственной страной в мире (вдумайтесь в это!), где еврейский народ не только погибал в гетто, но и оказывал сопротивление, воевал на опаленной белорусской земле в партизанских отрядах... В годы войны более 15 тысяч евреев находились в рядах подпольщиков и бойцов партизанских отрядов, участвуя в героической борьбе против фашизма. Евреи принимали участие в боевых операциях, "рельсовой войне", засадах, выполняли агентурные задания, собирали разведывательную информацию, были умелыми врачами, оружейниками, связистами..."

Мы расскажем о евреях, которые сражались с врагом в партизанском отряде имени М.И.Кутузова, который входил в состав 2-й Минской партизанской бригады. Имя великого русского полководца было присвоено отряду в декабре 1942 года. На день соединения с частями Красной Армии отряд насчитывал 268 партизан.

Бывшие узники Минского гетто активно участвовали во всех крупных боевых операциях отряда и бригады на территории Пуховичского, Минского, Стародорожского и Руденского районов. Во второй

половине 1943 года партизанами было подорвано более тысячи рельсов. 14 октября 1942 года на дороге Пуховичи — Омельно они уничтожили 9 автомашин, более 70 гитлеровцев. В январе-феврале 1943 года, июне 1944 г. бывшие узники гетто вместе со всеми партизанами 2-й Минской бригады вели тяжелые бои с карателями. Они разгромили вражеские гарнизоны в деревнях Омельно и Дражно*, вывели из строя электростанцию в Пуховичах, Седче. В октябре 1942-го — апреле 1943 годов народные мстители уничтожили 43 моста, а 28 июня 1944 года захватили переправу через реку Птичь и удерживали ее до подхода Красной Армии.

Командиром отряда имени Кутузова в июне 1942-го — июле 1943 годов был бывший узник и подпольщик Минского гетто Израиль Абрамович Лапидус.

С самого начала войны он ушел добровольцем на фронт, участвовал в боях под Смоленском, Ельней, Дорогобужем, Вязьмой. Затем воинская часть, в которой воевал Лапидус, попала в окружение. Он выходил из окружения, возглавив одну из групп красноармейцев. Несколько раз Лапидус попадал в плен, бежал. Этот мужественный и хладнокровный человек прошел пешком из-под Вязьмы до Минска. Когда Израиль Абрамович пробрался в гетто, то при первой же встрече с семьей сказал: "Я здесь, в гетто, оставаться не собираюсь. Я буду бороться, буду искать возможности уйти в партизаны. Пусть лучше мы погибнем в бою, но к расстрельной яме я своего сына не подведу".

Израиль Абрамович не позволил себе ни одного дня передышки и сразу же включился в подпольную

**Сцвярджэнне Эмануіла Іофе аб тым, што «бывшие узники гетто... разгромили вражеские гарнизоны в деревнях Омельно и Дражно» было прынята аўтарам напавер пры першым выданні кнігі. Пазнейшы архіўны пошук абверг гэты «гераізм». Падчас бою ў Дражна частка «бывших узников гетто» удзелу ў ім не прымала і сядзела ў засадзе згодна з планам аперацыі. Астатнія, згодна з тым жа планам, «зачысцілі» вёску.*

работу. Он стал одним из активных участников и организаторов подполья в гетто. Лапидус надолго уходил из гетто, занимаясь сбором оружия, медикаментов, выводом узников в лес.

Когда группа народных мстителей обсуждала кандидатуру командира партизанского отряда из узников гетто, сразу же остановились на Израиле Лапидусе. Один из руководителей подпольного центра в Минском гетто Г. Смоляр вспоминал:

"10 апреля 1942 года из гетто ушла группа человек в двадцать во главе с Исроэлем Лапидусом*. Илья Нарусевич обеспечил их автомашиной, раздобыл белорусского шофера, и группа выехала в направлении Слуцка. Одновременно на этом же направлении другая группа вышла пешком. Машина, доставив первую партию на место, вернулась за шедшими пешком и доставила их также во временный лагерь будущего партизанского отряда имени Кутузова, находившегося в лесу на 45-м километре между Минском и Слуцком. Вооружена эта группа была поначалу неважно: три винтовки, пять наганов, семнадцать гранат. За несколько дней группа выросла до 50 человек. Командиром нового отряда выбрали (тогда в партизанских отрядах еще выбирали командный состав) Исроэля Лапидуса, начальником штаба — техника-лейтенанта Сагальчика... С этим отрядом мы поддерживали постоянную связь".

Вскоре по окрестностям разнеслась весть о силе и доблести партизан-кутузовцев. Навсегда запомнился народным мстителям из отряда И. Лапидуса и вошел в историю партизанского движения бой у деревни Омельня на шоссейной дороге Пуховичи — Старые Дороги. Это было в октябре 1942 года.

В засаде находилось 60 партизан, когда показалась фашистская колонна из 10 грузовиков. Это был карательный отряд, вооруженный, как говорится, до зубов.

---

* *Гл. старонку 92*

После первого партизанского залпа ошеломленные каратели стали прыгать с машин. Вскоре разгорелся ожесточенный рукопашный бой, в котором было убито 74 гитлеровца, а 8 фашистов было взято в плен.

Легенды ходили о неуловимой группе подрывников, в которую входили белорус Николай Простак, еврей Лазарь Лосик, армянин Гурген Алексинян. Они действовали на направлении Руденск — Михановичи — Пуховичи. На счету этой группы 17 подорванных вражеских эшелонов. Лосик, Простак и Алексинян неоднократно попадали в засады, но выручали друг друга.

Боевая дружба связала Лазаря Лосика с партизаном Петром Ананичем. Когда его ранило во время одного боя 15 января 1943 года, то вынес Лосика с поля боя Петр Ананич. У Лазаря было сквозное ранение, но, несмотря на это, он назавтра стоял на посту в партизанском отряде. Не уступал своей отвагой и боевыми результатами и партизан Авром Холявский.

Велика была радость и гордость всего личного состава отряда им. Кутузова, когда среди первых белорусских партизан, награжденных медалью "Партизану Отечественной войны" I степени, был и подрывник немецких эшелонов Лазарь Лосик.

Слух о подвигах партизан пошел далеко, и отряд Лапидуса начал быстро расти. Пришли белорусы Константин Шелег и Эдуард Черняк, русские Борис Столбов и Степан Анохин, осетин Цакулов и цыган Золотаренко. В этом отряде сражалось до 500 человек, которые разделялись на 5 рот. Десятки вражеских эшелонов по маршруту Минск — Руденск — Пуховичи были на счету у группы подрывников, в которую входили Матвей Майзель, Владимир Цакулов, Владимир Розанов и другие. Медсестрой отряда была жена Матвея — Реня Майзель, удостоенная государственных наград. Не один раз приводил узников гетто в отряд им. Кутузова 12-летний Иосиф Левин.

Боевая деятельность партизанского отряда им. Кутузова — яркая страница в истории Великой Отечественной войны".

DRAZNO

Як бачым, трагедыя спалення Засценка ў папярэдніх дакументах ніяк не адлюстравана.

З артыкула ў «Советской Белоруссии» вынікае адно — «штурмаваў» велізарны гарнізон у Дражна адзін толькі атрад пад камандаваннем Ісраэля Лапідуса, а таксама тое, што аўтар артыкула палічыў больш значным бой ля Амельні. Але чаму гісторык не паказаў больш шырэй аперацыю па разгрому паліцэйскага гарнізона ў Дражна, дзе вораг панёс страт у тры разы больш, чым ля Амельні?

Каб знайсці адказ на гэта пытанне я адшукаў у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь некаторыя справы з фонда 2-й Мінскай партызанскай брыгады.

На стол ляглі збрашураваныя папкі з выцвілымі сінімі кардоннымі вокладкамі, у якіх пажоўклыя лісты вучнёўскіх сшыткаў захоўваюць трагедыі чалавечых лёсаў. Складаліся гэтыя дакументы ва ўмовах канспірацыі, бо, трапіўшы ў рукі ворага, маглі некалі каштаваць жыцця.

Дневник работы отряда и учета партизан, убывших в командировки и на боевые операции

(запіс за 05.01.43)

Пос. Параселки Гресского р-на
Послана разведка для уточнения гарнизона полиции в д. Дражное Стародорожского района. Военные занятия. Уставы гарнизонной и внутренней службы. Привезен 2-й авиационный пулемет.

Фонд 4057, вопіс 1, справа 45, аркуш 14.
Вучнёўскі сшытак ў клетку.
Рукапіс выкананы хімічным алоўкам.

Дзённік — гэта каля дзесятка збрашураваных школьных сшыткаў.

Запіс у ім — звычайнае адлюстраванне партызанскіх будняў. Відавочна, форма запісу ў дзённіку была адвольнай. Хто адказваў за дакладнасць звестак у дзённіку і хто вёў запіс, невядома. Радкі, выкананыя хімічным алоўкам, практычна не даюць аніякай канкрэтнай інфармацыі, акрамя таго, што ў атрадзе пастаянна нечым займаліся. Пры такой бязлікай падачы матэрыялу любы правяральшчык не мог бы падлавіць на хлусні.

У запісе ад 15.01.1943 г. маецца інфармацыя аб нападзе партызан на паліцэйскі гарнізон у Дражна. Даслоўна:

DRAZNO

В пос. Великий Бор отряд прибыл в 6 ч. утра и двинулся на д. Дражно в составе бригады. Лошадей оставили в лесу в 2х клм от Дражное. 2ой и 5ый отряд двинулись на Дражное. Было организовано три засады. Недоходя клм д. Дражное развернулись в боевой порядок. 2ой отряд шел левым флангом, а 5ый отряд правым флангом. Открыли ураганный огонь. Бой начался в 8 часов. Полицейские фашистские псы начали обстреливать нас из дотов. Местность совершенно ровная, открытая. Очевидно местность была пристреляна. Первым был убит патриот родины врач отряда т. Налибоцкий*. Под ураганным огнем отряд перебежками начал наступать на дер. Дражное. Отличились в бою: первыми бежали и вошли в д. Дражное 1ой взвод 1ое отделение Черник, Соловей (пулеметчики), командир взвода Анохин, командир отд. Столбов.

2 отд. 1й взвод.

Впереди шли и первыми вошли в д. Дражное Агейчик, Лапидус Семен, Билейчик, бесстрашно в бою держал себя Савенко быстро выполнял приказания комбрига и командира отряда.

2й взвод 3 отделение

Первыми шли в бою и вошли [в] д. Дражное: Акулич, Кожемяченко, Холявский, командир взвода Шелег Константин, Янкелевич, Калинин в д. Дражное убил 2х полицейских.

2й взв. 4ое отд.

Радкевич под градом пуль вынес из поля боя миномет с минами, оставленный 2м отрядом. Бойцы 5го отряда ворвались в д. Дражное и были 2 часа в деревне.

Около 11 ч. дня на 4х машинах подъехали немцы для поддержки полицейских. Одна машина засадой была подбита. Около 30 немцев было убито. Немцы начали наступать на д. Дражное открыв сильный огонь. 2й отряд отошел из д. Дражное в 1 ч. дня. Потери полицейских не установлены. Потери нашего отряда убито 2** ранено 8***. Кроме того обмороженных пальцев ног и рук 10 ч.

Фонд 4057, вопіс 1, справа 45, аркушы 16—17 адв.

---

* *Налібоцкі Вульф Борухавіч, урач, прыбыў у атрад у красавіку 1942 года.*

** *Лічба 2 перапраўленая з лічбы 8.*

*** *Лічба 8 перапраўленая з лічбы 2.*

Можна заўважыць, што ні ў планах брыгады, ні ў планах атрада аперацыя 15.01.43 не значылася. Ва ўсялякім выпадку гэта вынікае з той дакументацыі, якая вялася і якую ўдалося адшукаць. У "Дзённіку" зафіксаваны першы паход на Дражна, аб якім успамінаюць і жывыя сведкі дражненскага Засценка. Заўважым, што колькасць удзельнікаў рэйду не пазначана. І гэта зразумела: калі даваць колькасць удзельнікаў аперацыі, то тады трэба будзе паказваць і страты. Ды і спаганялі наверсе больш не за сваіх загінуўшых, а за забітых немцаў. Таму страты, нанесеныя ворагу, значна завышаліся, а пра свае — маўчалі. На жаль, з дакумента аднавіць поўную карціну студзеньскай трагедыі немагчыма. Атрымліваецца, што амаль усе партызаны з таго студзеньскага бою вярнуліся на базу. Дык хто ж тады ляжыць побач з вёскай у брацкай магіле? Чаму яна да сёння безыменная? Зрэшты, якім чынам і хто падлічыў страты, нанесеныя ворагу ў тым "вясёлым" рэйдзе? Аб "стратах", якія панёс вораг, дарэчы, было дакладзена наверх. Яны былі зафіксаваны на асабістых рахунках партызан атрада імя Кутузава і іншых атрадаў і аказаліся даволі ўнушальнымі: ні многа ні мала 70 забітых немцаў і 34 забітыя паліцаі! Калі ўжо так храбра ваявалі, то чаму ледзь не страцілі мінамет, не забралі забітых таварышаў? Хутчэй за ўсё маюць вяскоўцы рацыю: не было каму іх забіраць. Усіх, хто сунуўся на ўскрай вёскі, паклаў паліцэйскі дзот. Магчыма, дзесьці ў аддаленні, у лесе для прыкрыцця былі яшчэ

нейкія байцы атрада, але яны, відаць, палічылі за лепшае не совацца.

Далейшыя пошукі ў архіве пацвердзілі гэту думку. У звязцы сшыткаў з баявымі рахункамі партызан атрада імя Кутузава (у самым канцы гэтай звязкі) быў прыладжаны сшытак, які адрозніваўся сваім памерам. У гэты сшытак, у асноўным, занесены прозвішчы партызан, на рахунку якіх ніякіх баявых аперацый не значыцца.

Я перагортваў пустыя старонкі, пакуль не пачалі трапляцца запоўненыя. І раптам — удзельнікі студзеньскага бою ў Дражна! Так і пазначана: загінулі ў баі 15.01.43 г.:

Евсиевич Михаил Иванович
(в отряде с октября 1942 года),

Акулич Иван Лаврентьевич
(в отряде с ноября 1942 года),

Ильин Василий Дмитриевич
(в отряде с ноября 1942 года),

Шашок Петр Михайлович
(в отряде с января 1943 года).

Тут жа значыцца прозвішча і загінуўшага ўрача Налібоцкага.

Асабліва ўразіла наступнае:

Сташенко Алексей Игнатьевич.
Расстрелян командиром бригады
за невыполнение приказа идти в бой.

Значыць, не здрадзіла дзецям вайны памяць, праўду гавораць дражненскія сведкі. Авантура са штурмам вёскі была настолькі

відавочнай, што не ўсе партызаны рызыкнулі імгненна развітацца з жыццём. Давялося страляць сваіх.

Згодна з запісам у кнізе *"Боевые счета партизан отряда им. Кутузова"* у тым боі, акрамя названых вышэй (загінуўшых) партызан, удзельнічалі:

Агинский Ефим Самуилович
Ананьев Сергей Сергеевич
Арземанов Арсен Ефремович
Ахремчик Михаил Демьянович
Безобразов Гавриил Харитонович
Билейчик Владимир Денисович
Воробьев Григорий Абрамович
Гаев Владимир Петрович
Гуринович Михаил Иосифович
Дукорский Григорий Лейбович
Кашкан Антон Филиппович
Кирильчик Александр Иванович
Колодяжный Алексей Григорьевич
Курьянович Адам Яковлевич
Лапидус Семен Абрамович
Лариков Митрофан Артемович
Леднев Степан Потапович
Лосик Лазарь Владимирович
Наумчик Александр Иванович
Пархимчик Николай Константинович
Пензий Виктор Максимович
Плеханов Алексей Степанович
Плыженков Николай Афанасьевич
Пранович Иван Савельевич
Працкевич Константин Аксенович
Радкевич Иван Игнатьевич
Розанов Владимир Владимирович
Рубинсон Калман Янкелевич
Савенко Павел Акимович
Сапун Леонид Федорович
Столбов Даниил Трофимович
Федотов Иван Тимофеевич
Фельдман Григорий Моисеевич
Халявский Абрам Борисович
Черник Эдуард Иванович
Чешко Павел Иосифович
Шалман Рафаил Вениаминович
Шелег Аркадий Федорович

DRAZNO

Шелег Владимир Данилович
Шелег Константин Малахович
Шнейдер Ефим Семенович
Юшкевич Николай Эдмундович
Янкелевич Иосиф Копелевич

Фонд 4057, вопіс 1, справа 43.

Такім чынам, калі верыць партызанскім дакументам, у дадатак да згаданых шасці загінуўшых партызан яшчэ звыш 40 байцоў атрада імя Кутузава мелі дачыненне да студзеньскага штурму Дражна.

Зразумела, за бяздарнае правядзенне аперацыі (разведка гарнізона, відаць, увогуле не праводзілася) адказнасць павінна было несці камандаванне 2-й Мінскай партызанскай брыгады. Аднак паколькі яно мела непасрэднае дачыненне да гібелі значнай колькасці партызан, то хавала праўду, скажала карціну таго, што адбылося, патурала прыпіскам. У дзённіку атрада імя Кутузава запісана:

Около 30 немцев было убито... Потери полицейских не установлены.

І ўжо пазней у іншых дакументах па гэтай аперацыі на баявых рахунках партызан атрада імя Кутузава з'яўляюцца лічбы забітых: 70 немцаў і 34 паліцаі. Трэба аддаць належнае, што гэта не самае вялікае скажэнне вынікаў першага штурму Дражна. "Рэкорд" паставілі партызаны атрада імя Суворава. У студзеньскім штурме на свае рахункі яны запісалі 104 забітых гітлераўца!

Сапраўды, чаму і не прыпісаць: нябожчыкі ж не ўстануць, не раскажуць. Ну, а жывым так ці інакш справаздачу трымаць за забітых

немцаў і ўдзел у баявых аперацыях. Хадзілі ж, сядзелі ў лесе... І ліпавыя лічбы нанесеных ворагу "страт" пайшлі гуляць па інстанцыях.

Цалкам запіс за той дзень у дзённіку баявых дзеянняў атрада імя Суворава выглядае наступным чынам:

15.1.43. Бригадная операция по разгрому полицейского гарнизона Дражно. Убито и ранено 104 гитлеровца. Наши потери: убитые — Шипилов, Ермолаев, Дженбаев, Сипач К., Губаревич, Баран О., Касько. Раненые — Фридман, Хаткевич В.

Руководил операцией — комбриг Иванов.

Фонд 4057, вопіс 1, справа 75, аркуш 13.

Гэта значыць, што на абеліску ля Дражна колькасць вядомых імёнаў павялічылася да трынаццаці! Невядомымі пакуль што застаюцца прозвішчы сямі чалавек.

Выявіць ашуканства з уласнымі стратамі падчас акупацыі было немагчыма. Для гэтага давялося б эксгумірваць трупы, што знаходзіліся ў брацкай магіле.

Пасля вызвалення большасць партызан пайшла на фронт, на месцы зноў з'явілася Савецкая ўлада. Для людзей галоўным тады было — што вайна скончана. Але якім коштам?.. Уладу ніколі не цікавілі сапраўдныя абставіны гібелі дваццаці партызан і іх імёны (хаця любы вясковец мог бы патлумачыць, як усё было, а архіў — даць іх прозвішчы). Да цяперашняга часу ля дарогі з Вялікага Бора ў Дражна вечным сном спяць героі безыменнымі. У імя святой мэты і з-за бяздарнасці свайго камандавання аддалі яны сваё жыццё.

Пасля занатаваных абставін бою 15 студзеня 1943 года ў дзённіку атрада імя

Кутузава ішлі запісы за іншыя дні. Але яны абарваліся на старонцы за 5 красавіка. Аркуш з запісам за гэты дзень быў напалову чыстым. Відавочна, свабоднае месца належала запоўніць падрабязнасцямі нейкай аперацыі.

Шчыльна да старонкі дзённіка з запісам за 5 красавіка 1943 года месціцца вокладка "Дзённіка камісара атрада імя Кутузава". Першы запіс у гэтым дзённіку зроблены толькі 24 красавіка 1943 года. Такім чынам у абавязковай партызанскай справаздачнасці аказаўся неадлюстраваным перыяд з 5 па 24 красавіка ў які і адбылася трагедыя ў Дражна. Я звярнуў увагу на тое, што як дзённік работы атрада, так і дзённік камісара, і наступныя дакументы гэтай папкі мелі некалі агульную брашуроўку (зшыўку), ад якой на сёння засталіся толькі зробленыя шыльцам адтуліны. Каму і калі спатрэбілася расшываць дакументы? Ці не з мэтай анулявання сведчанняў, звязаных з падзеямі азначанага перыяду?

Жорсткасць супрацьстаяння акупантаў і партызан была тады на самай высокай кропцы адліку. Кожны бок без літасці катаваў і знішчаў адзін аднога.* Здавалася б, небяспека павінна была дысцыплінаваць партызан. Аднак у 2-й Мінскай брыгадзе (і ў атрадзе імя Кутузава, у прыватнасці) усё было наадварот. Ніжэй прыведзены два дакументы на гэты конт.

**Маштаб грамадзянскай вайны на Беларусі ў той час адлюстраваны ў кнізе нямецкага гісторыка Бернгарда К'яры «Штодзённасць за лініяй фронту», Мінск, 2005 г.*

Командиру 2-й Минской
Краснопартизанской бригады

ДОНЕСЕНИЕ

...Подрывная группа во главе со старшим группы партизаном Федотовым и подрывников: Агинского, Розанова, Майзеля, Гантмана и Лапидуса М. была послана в западную БССР на подрыв вражеского эшелона. Данная группа в силу усложнившейся обстановки взрыв сделать не смогла. Возвратясь... в отряд подрывная группа представила фиктивный акт о произведенном взрыве, в результате чего было уничтожено 4-е вагона с боеприпасами замаскированных в сене, повреждено 2 вагона и паровоз.

Произведенным расследованием и дознанием следственных органов ОО НКВД вся преступная деятельность подрывной группы установлена, опрошенные лица по данному делу сознались и показали, что взрыв в р-не ж.д. Столбцы—Осиповщина произведен не был. Инициатором в составлении фиктивного акта был старший группы Федотов, остальные дали на это согласие.

За проявленное очковтирательство, обман и неискреннее признание командованием отряда наложено следующее взыскание: старшего группы Федотова РАССТРЕЛЯТЬ, но учитывая прежние боевые заслуги и подвиги в борьбе с немецкими захватчиками, по взрыву вражеских эшелонов, в разгроме гарнизонов и других диверсий расстрел заменили 20 сутками ареста.

Подрывников Агинского, Розонова, Лапидуса, Майзеля и Гантмана

Арестованы 20 сутками ареста.

Для исправления своей вины данная подрывная группа обязана произвести ДВА взрыва вражеского эшелона до 26-й годовщины Великой Октябрьской Революции.

О чем доносим.

Командир отряда

Комиссар

Фонд 4057, вопіс 1, справа 44, аруш 24. Машынапіс.

DRAZNO

У дакументе на стар. 48 згадваюцца:

Агинский Ефим Самуилович, еврей, 1922 г. рожд., до войны гример Театра оперы и балета в Минске.

Лапидус Михаил Рафаилович, еврей, 1925 г. рожд., до войны учащийся Минского политехникума.

Гантман Абрам Самуилович, еврей, 1915 г. рожд., до войны военнослужащий, затем военнопленный, бежал из Минского гетто.

Майзель Мота Лазаревич, еврей, 1923 г. рожд., до войны учащийся СШ в Минске.

Розанов Владимир Владимирович, русский, 1919 г. рожд., до войны заключенный в г. Пинске.

Федотов Иван Трофимович, русский, 1922 г. рожд., до войны военнослужащий.

Сов. секретно

Командиру и комиссару
2-й Минской партизанской бригады
т.т. Иванову и Михайлову

ДОКЛАДНАЯ ЗАПИСКА

О политико-моральном состоянии отрядов нашей бригады по состоянию на 15. III. 43

Несмотря на ряд проводимых мероприятий командованием и политаппаратом бригады по изжитию в отрядах пьянок, мародерства, других аморальных проявлений, на сегодняшний день данные случаи не изжиты, а, наоборот, возрастают и мешают в работе отрядов по налаживанию дисциплины.

По отрядам имеем следующие факты: [...]

отр. Кутузова

[**а**]В феврале 1943 года группа партизан находилась на боевой операции по срезке телеграфных столбов по жел. дороге, достигли деревень Гребень, Бирчуково (*так у тэксце, магчыма, маецца на ўвазе сёняшняя вёска Берчукі — **В.Х.***) часть из них напились пьяные, м-л к-р Алинин пьяный угрожал расстрелом одному бойцу. К-р взвода Шелег был ранен своими случайными выстрелами вследствие сильного опьянения, на боевой операции не участвовали к-р взвода Шелег, к-ры отд. Калинин, Воробьев и партизан Шелег. Возвратясь с боевой операции, к-р отряда Лапидус наложил взыскание: Алинину — на вид, остальным — простил.

[**б**]...5. III. 43 года рота под командованием к-ра роты Гаева выехала на засаду под Шацк, проезжая д. Полодзь заехали во двор к крестьянину Гуриновичу Маруку и без спроса у крестьянина — по приказанию Гаева выдрали 3 семьи пчел, забрали цебар и уехали. Возвращаясь обратно, заехали к Гуриновичу М., выдрали еще 7 семей пчел, сломали замок, влезли в хату, забрали все вещи, вплоть до чугуна, забрали также 4 овечки, 2 свиней и прочее.

DRAZNO

Данным мародерским поступком возмущено все население и требует от командования защиты. Кроме этого, Гаев* не выполнил приказ на засаду. В результате того, что занимался не засадой, а мародерством потерял одного партизана.

За отрядом Кутузова мародерских поступков среди населения очень много, поэтому требуется по данному вопросу принять меры в самом жестком порядке...

Начальник ОО НКВД 2-й Минской
партизанской бригады
18. III.1943 Безуглов *(Подпись)*

Фонд 4057, вопіс 1, справа 27, аркушы 5—6. Папяросная папера, машынапіс.

---

* *Гаеў Уладзімір Пятровіч, 1908 г. нар., беларус, да вайны лейтэнант запасу, на пачатку вайны працаваў ст. упаўнаважаным Чыжэўскага РО НКВД Беластоцкай вобласці.*

Дакументы на стар. 48—51 седчаць аб нездавальняючай дысцыпліне і нізкім «баявым духу» у 2-й Мінскай партызанскай брыгадзе ў сакавіку 1943 года за месяц да спалення дражненскага Засценка. Гэта нельга не ўлічваць пры разглядзе прычын трагедыі. Як бачым, "байцы" былі распушчаны: гарэлка, разбой, сваіх стралялі без прычыны.

Да спалення вёскі падштурхоўвалі і запыты з Масквы аб баявых дзеяннях. І калі адны атрады імкнуліся сумленна выконваць баявыя задачы і неслі з-за гэтага страты, другія, каб не несці гэтых страт, сталі на шлях, самазахавання і прыпісак. Уважлівае вывучэнне дакументаў дазволіла зрабіць такі вывад і ў адносінах да атрада імя Кутузава.

З архіўных дакументаў вынікае: баявая аперацыя 2-й Мінскай партызанскай брыгады па разгрому гарнізона ў Дражна на красавік 1943 года не планавалася. У "Планах и отчетах о боевой деятельности отряда имени Кутузова" на красавік запісана:

Засада на шоссе Минск—Слуцк, ответственный — Гаев, количество участвующих — 60 человек, срок — 6. 4. 43.

Засада на шоссе Слуцк — Минск ответственный — Абрамов, количество участвующих — 50 человек, срок — 13. 4. 43.

Засада на Пуховичскую полицию, ответственный — Гаев, количество участвующих — 60 человек, срок — 17. 4. 43.

Фонд 4057, вопіс 1, справа 42, аркуш 7.

DRAZNO

Як бачым, з 13 па 17 красавіка 1943 года атрад Кутузава не планаваў ніякіх баявых аперацый, а згаданы дакумент не падпісаны камандаваннем атрада. Чаму? Зразумела, не таму, што ў камандзіра ці камісара атрада не хапіла на гэта часу. Мець непрыемнасці з-за такой дробязі ні адзін камандзір не стаў бы. Хутчэй за ўсё дакумент складзены і далучаны да справы тады, калі нехта з трох адказных асоб атрада (камандзір, начальнік штаба, камісар) не мог яго падпісаць па нейкіх прычынах. Ці не пасля вызвалення ў 44-м ён складзены, калі кіраўніцтва атрада знаходзіліся на новых месцах службы, а справы здаваліся ў архіў? Навошта было яшчэ раз крэсліць напамін аб спаленні Дражна? Каму гэта было выгадна?

Але гэта не апошняе непаразуменне ў дакументацыі атрада. Здзіўляе інфармацыя, змешчаная ў *"Журнале боевых действий отряда имени Кутузова"*. Адносна згаданай аперацыі знаходзім там табліцу (гл. стар. 54)

У гэтай табліцы звяртае на сябе перш за ўсё той факт, што аперацыя праходзіла *пад Дражна*. Так звычайна пішуць, калі дзеянне адбываецца не ў самім населеным пункце (пад Мінскам, пад Берлінам і г.д.), а дзесьці побач з ім. Відавочна, той хто пісаў, ведаў, што сама вёска і сапраўды была некранута агнём, а згарэў яе "прыгарад" — Засценак. Выклікае цікавасць і колькасць забітых — 225 чалавек. Пры гэтым катэгорыя забітых ніяк не акрэслена, што само па сабе незразумела, хаця па сутнасці правільна — у таго, хто пісаў, рука не паднялася назваць мірных жыхароў паліцаямі ці немцамі.

№п/п	Дата	Наим. операции и место	Руководитель операции	Жертвы и трофеи противника	Наши потери	Особо отличившиеся на операции	Кто давал приказание на операцию
30	*13.4.43*	*Боевая операция под Дражно (разгром полицейского гарнизона)*	*Отряд действовал в в составе всей бригады убито 225 чел. взято в плен 8 человек*				*Комбриг*

Фонд 4057, вопіс 1, справа 47, аркуш 6

Што ж датычыць колькасці ахвяр, то гэта партызанская завычка — завышаць яе ў разы.

Параўнаем запіс у табліцы з запісам гэтай "аперацыі" на баявых рахунках партызан атрада імя Кутузава. На гэты конт там запісана так:

14.4.43. Участвовал в разгроме полицейского гарнизона Дражно где было уничтожено 217 чел. разных сволочей и 8 взято живьём.

Зусім відавочна, што згаданы запіс і запіс у табліцы на стар. 54 зроблены рознымі аўтарамі ў розны час: не супадаюць даты і фармулёўкі. З'явілася ўдакладненне катэгорыі забітых. З простых забітых *"человек"* яны сталі *"разными сволочами"*. Гэта і зразумела: наверсе без "сарціроўкі" трупаў справаздачу не прынялі б. Катэгорыя ж "сволачы" была там добра вядома і адпрацавана яшчэ ў 1937-м. Сволач — гэта значыць свой браце, беларус, за якога ніхто спаганяць не будзе. Чаму сволач? Ды проста таму, што жыве ў сваім доме, а не ў лесе (Сталін не вельмі давяраў беларусам).

Адчуваецца рука работніка НКУС у вызначэнні фармулёўкі. Звернем увагу на лічбу 8. У першым выпадку (у табліцы) ёй пазначаны *"ўзятыя ў палон"*. Але што значыць узяць у палон таго, хто супрацоўнічаў з немцамі? Гэта значыць, што, як мінімум, такіх людзей трэба дапытаць пра ўсе бакі функцыяніравання паліцэйскага гарнізона, пра інфарматараў-здраднікаў і г.д. Пра захоп у палону павінен быў застацца запіс. Калі ж каго-небудзь з

захопленых расстрэльвалі, то таксама складаўся акт на прадмет таго, калі і за што гэта зроблена. У фармулёўцы *"взято живьём"* большы прастор для садысцкай казуістыкі. Каго ўзялі жывым мог праз паўгадзіны памерці ад ран, мог зрабіць пабег і мог быць забіты падчас такога пабегу. А гэта значыць, што атрад нібыта і ўзяў жывыя "трафеі", на якіх настойваў Сталін, але, выбачайце, да вяртання ў лес не захаваў (М. І. Пятроўскі расказваў, як забілі яго брата Валодзю. Гэта, відаць, і быў адзіны "палонны").

Звернем увагу на запіс спалення Дражна ў дзённіку баявых дзеянняў атрада імя Суворава, які таксама ўдзельнічаў у аперацыі:

14.4.43 Разгром полицейского гарнизона Дражно. Убито и ранено 217 гитлеровцев. Наши потери: убитые — Рублес, Шамак Н., Баранов, раненые — Чайковский А., Чешко Н.

Руководил операцией комбриг Иванов*.

Фонд 4057, вопіс 1, справа 75

Як бачым, і тут недакладнасць у вызначэнні выніку карнай аперацыі. Пра палонных ці "взятых живьем" гаворка ўжо не ідзе, пералічаны асабістыя страты. Відавочна, гэты атрад трапіў пад агонь паліцэйскіх дзотаў.

У тым боі панёс страты і атрад імя Чапаева. У кнізе выбыўшых партызан гэтага атрада запісана што:

---

* У **гісторыі** *атрада імя Суворава ў сувязі з згаданай аперацыяй называюцца прозвішчы загінуўшых: Рублёў, Баран і Шмак.*

Цыманов Павел Евменович,
Соловьев Леонид Васильевич,
Антонов Анатолий Кузьмич,
Лукьянчик Степан Максимович,
Дубовик Степан Поликарпович,
Шелег Николай Кузьмич
погибли 14. 4. 43.

Место похорон — поле боя Дражно Стародорожского района.

Фонд 4057, вопіс 1, справа 92, арк. 14.

Гэты запіс дазваляе зрабіць вывад аб тым, што і пры другім штурме Дражна партызаны панеслі страты. Калі наступалі атрады імя Суворава і Чапаева, ім было аказана супраціўленне (інакш не было б столькі ахвяраў). Атрад жа Лапідуса страт асабовага складу не панёс. Чаму?

На жаль, усе прагледжаныя ў архіве дакументы не дазволі аднавіць падрабязную карціну той страшнай трагедыі з пазіцыі забойцаў. Ніякіх канкрэтных (з прозвішчамі) запісаў аб тым, як пачыналася і праходзіла "аперацыя", адшукаць не ўдалося. Хаця дакументы павінны былі быць. Разгром такога вялікага гарнізона — з'ява падчас вайны далёка нерадавая. Самі партызаны павінны былі надаць ёй шырокі прапагандысцкі характар. Аднак яны гэтага не зрабілі. Ці не таму, што ў адказ немцы б сказалі праўду. І ўжо хочаш-ніхочаш, а адпаведным органам давялося б разбірацца з абставінамі спалення вёскі. Паколькі акупантам дакладна, відаць, не было вядома, хто паліў вёску, ды і ніхто з немцаў не быў забіты, то справа з іх боку не атрымала прапагандысцкага працягу.

Фармулёўка камбрыга Іванова з забітымі "сволочами" даволі унікальная, не мае аналагаў у гісторыі партызанскага руху на Беларусі. Тым больш дзіўна, што канкрэтныя дадзеныя па нанесеных ворагу стратах маюцца, скажам, у справаздачнай дакументацыі атрада імя Кутузава ў адносінах да іншых аперацый аж да часу вызвалення ў 1944-м. Але толькі не ў адносінах да "штурму" Дражна! Відавочна, той, хто рабіў чорную справу, ведаў, чым яна можа абярнуцца. Зрэшты, ведаў ён і тое, што праверыць яе вынікі будзе немагчыма. Ва ўсялякім разе адразу: паліцэйскі гарнізон практычна не пацярпеў і трапіць у Дражна па-ранейшаму было немагчыма.

Між тым чуткі аб трагедыі так ці інакш прасочваліся за межы шматпакутнай вёскі. Хутчэй за ўсё спрыялі гэтаму паліцэйскія, якія выязджалі па справах у Старыя Дарогі і наваколле. Камандаванне партызан-скай брыгады (а магчыма, і злучэння), відаць, было гэтым усхвалявана. "217 разных сволочей" маглі значна падарваць рэпутацыю партызан у вачах мясцовага насельніцтва. Вынікі ад гэтага маглі быць самымі непажаданым — непасрэдныя ўдзельнікі злачынства маглі трапіць пад трыбунал.

Даследуючы архіўныя матэрыялы 2-й Мінскай партызанскай брыгады, мне нечакана патрапіў цікавы дакумент. Нечаканасць была ў тым, што дакумент гэты знаходзіўся ў справе №42 фонду 4057, якая непасрэднага дачынення да згаданай трагедыі не мае. Аркушы ў папцы, як і належыць у архіўнай

справе, размешчаны ў строгай храналогіі і толькі аркушы 81, 82 і 83 знаходзяцца не на сваім месцы. Прычым выпадаюць гэтыя дакументы з раду такіх жа як па змесце, так і па даце. Ушыты яны ў страявыя запіскі атрада імя Кутузава. Прычым на аркушы 80 змешчана такая запіска за 10 красавіка *1944* года, на аркушы 84 — за 20 красавіка *1944* года. На старонках жа 81—83 дастаткова выразна пазначаны даты *"19.IV.43"*. Цяжка паверыць, што так груба памыліліся архівісты. Калі ж паглядзець на змест аркушаў 82— 83, то стане ясна, што схаваны яны тут невыпадкова. Вось што на іх напісана:

РАЗБОР БОЕВОЙ ОПЕРАЦИИ ПО РАЗГРОМУ ПОЛИЦЕЙСКОГО ГАРНИЗОНА В ДРАЖНО

Бой в Дражно выявил массу недостатков в учебной и боевой работе отрядов не только со стороны бойцов, но и командиров. В дальнейшей повседневной работе с бойцами командирам всех степеней учесть нижеуказанные недостатки и обратить общее внимание на устранение их.

I. НЕДОСТАТКИ НА ПОХОДАХ

Неорганизованность — командиры всех степеней мало обращают внимания на дисциплину и порядок марша, а отсюда вытекает, что командиры не знают своих мест, колонна растеривается, получается шум, крики.

II. НЕДОСТАТКИ В НАСТУПЛЕНИИ ПРИ СБЛИЖЕНИИ С ПРОТИВНИКОМ

1. Командиры всех степеней не выполняют своей роли командира, т.е. держать свое подразделение в кулаке и командовать им, а поэтому получается:

а) что вторые эшелоны взводов и рот ведут огонь по своим первым эшелонам.

б) командиры подразделений, взводов, рот теряют свои подразделения и остаются одни, получается смешивание подразделений

III. НЕДОСТАТКИ В БОЮ

1. Нет огневой поддержки как между подразделениями, так и отдельными бойцами, что и дает повод к лишним и ненужным потерям.

2. Работа связных как между подразделением и командиром отряда, так и от командира отряда к моему командному пункту никуда не годятся, что нарушает руководство и систему боя. Всвязи с этим каждому командиру отряда выделить 6 человек связных постоянных и обучить связной работе в бою.

3. Отходы совершаются совершенно неправильно, не по уставному, отсюда лишние жертвы. Научить весь личный состав совершать отходы по уставу.

4. В бою является хорошим качеством бойцов — товарищество, дух одной сплоченной семьи а отсюда принять за правило внедрять в нашу жизнь тов[арищескую] помощь и выручку, которая и будет нашим си[...] к порыву и стремлению уничтожить врага.

5. Еще не все командиры поняли, что раненые и убитые бойцы выносятся с поля боя в процессе боя и никогда откидывать нельзя, а поэтому принять за правило и в каждом бою организовать вынос с поля боя раненых.

6. Хотя я указывал и обращал внимание командиров на блокировку дзотов и зданий, но многие командиры еще не поняли важности и умения блокировать, а поэтому при блокировке понесли опять-таки ненужные жертвы.

7. Многие еще командиры не понимают партизанской тактики ведения боя, не заканчивают бой до конца и трофей не захватывают. По этому поводу тов. СТАЛИН сказал: "Убитых много, а трофей захвачено мало". В дальнейшем любой бой сводить к стремлению к захвату трофей, и убитые будут считаться только по количеству трофейного оружия.

Особое внимание командиров всех степеней и всего личного состава бригады еще раз обращаю на сохранение воинской тайны, виновные в разбалтывании военной тайны будут привлекаться к суровым мерам наказания вплоть до расстрела.

ИТОГИ БОЯ

В основном, исключая эти недостатки, бой прошел очень удачно. Свою задачу выполнили, гарнизон разгромлен полностью за исключением 5 дзотов из которых войти не удалось, остальная полиция уничтожена, убитыми и задохнувшимися от дыма насчитывается до 217 сволочей, если учитывать засаду отряда "Сокол" то следует приплюсовать еще 19 сволочей и машину.

DRAZNO

ВСЕМУ ЛИЧНОМУ СОСТАВУ
а) отряда им. Чапаева,
б) —"— им. Ворошилова,
в) —"— им. Суворова,
г) —"— им. Сокол
ОТ ЛИЦА СВОЕЙ СЛУЖБЫ ОБЪЯВЛЯЮ БЛАГОДАРНОСТЬ

На особо отличившихся бойцов и командиров представить списки к награждению.

К раненым бойцам и командирам проявить отеческую заботу и нежность, чтобы скорей встали в строй бо[рьбы] за свободу.

Командир 2-й Минской бригады ***Иванов*** (Подпись)
Комиссар ***Чапаев*** (Подпись)
Начальник штаба ***Тищенко*** (Подпись)
19.IV.—43 года.

Нават неспрактыкаваны даследчык можа заўважыць некаторыя цікавыя акалічнасці гэтага дакумента. Нягледзячы на нейкія згадкі пра забітых і раненых партызан лічбы ўласных страт у ім так і не прыводзяцца.

У дакуменце не названа ніводнага прозвішча ці нумара падраздзялення. Карысці з такога дакумента для павышэння баявой падрыхтоўкі аніякай.

Звяртае на сябе ўвагу нададзенае значэнне трафеям. І гэта нездарма. Цяжка ўявіць, каб бой, у якім забіта каля 250 ворагаў, скончыўся тым, што нават пісталета не ўдалося захапіць. Таму адсутнасць трафеяў, прыкрытая разважаннямі пра словы Сталіна, яшчэ раз падкрэслівае, *партызаны не здолелі адолець Дражненскі паліцэйскі гарнізон.*

Чытаем уважліва: *" Свою задачу выполнили, гарнизон разгромлен полностью, за исключением 5 дзотов, из которых войти не удалось".*

Я некалькі разоў прачытаў арыгінал. Так напісана, прачытана і падпісана камандзірамі: *"...5 дзотов, из которых войти не удалось"*. Думай і мяркуй пра тыя дзоты, што хочаш. Можна зваліць на памылку машыністкі, што друкавала даку-мент. Ды, відаць, не ўсё так проста. Відавочна, на тыя дзоты ніхто і не кідаўся, бо ў адваротным выпадку, вынікі для "партызан" былі б сапраўды трагічнымі. Зрэшты, што за разгром паліцэйскага гарнізона, калі яго аснова — дзоты засталіся неліквідаванымі? Канешне, каб маглі — "знішчылі" б на паперы і дзоты. Ды дзот — умацаванне, а не чалавек. Калі ўжо застаўся некранутым, то бачны здалек, і самая простая разведка пакажа, што ў Дражна ўсё засталося на месцы. Таму для павышэння "каэфіцыента карыснага дзеяння" забівалі мірных грамадзян. Чаму палілі хаты, таксама зразумела. У спаленую з жыхарамі хату на паперы можна было змясціць некалькі дзеяткаў "забітых паліцаяў": ніхто ж не пойдзе правяраць. Жорсткасць — не дзіва: калі па пьянцы стралялі сваіх таварышаў, то жалю да мірных жыхароў Дражна, што жылі ў паліцэйскім гарнізоне, зразумела, быць не магло.

Калі ж чад ад крывавай справы прайшоў і злачынства стала відавочным, відаць, не ўсе былі згодны з афіцыйнай ацэнкай падзеі. Магчыма некаторых з удзельнікаў даймала сумленне, яны дававалі сваю адмоўную ацэнку таму, што здарылася. Таму ў згаданым дакуменце з'явілася папярэджанне аб неаб-

ходнасці захавання воінскай тайны. Балбатунам — расстрэл. Не трэба гаварыць, што гэта папярэджанне было не пустым гукам. Любая трактоўка падзей вакол Дражна, акрамя афіцыйна прынятай, была б патлумачана як наўмысная кампраметацыя камандавання з належнымі адсюль вынікамі. Паміраць ніхто не хацеў. Становіцца зразумелым маўчанне ўдзельнікаў тых падзей і пасля вайны. Нават той, хто і хацеў нешта расказаць, баяўся раскрыць "ваенную" тайну — органы НКУС не цырымоніліся.

Абсалютна здзіўляе ў дакуменце, што сярод тых, каму раздаваліся ўдзячнасці, няма атрада імя Кутузава. Ці не таму, што Засценак паліў менавіта ён (што вынікае з расказаў жывых сведкаў і асабістых баявых рахункаў партызан гэтага атрада).

Што ж датычыць самаго Лапідуса, пра якога "Советская Белоруссия" пісала як пра героя, то адшукаць яго імя ў архіўных дакументах 2-й Мінскай партызанскай брыгады аказалася справай вельмі няпростай. Яно не значыцца ў спісе асабовага складу атрада імя Кутузава, не згадваецца ні на адным з дакументаў атрада ў той час, калі ён ім камандаваў (раней 15.04.43 года). Вычысціў яго нехта з папер добрасумленна. А мо то сам "герой" не хацеў заставацца ў гісторыі?

Але, калі ўважліва гартаць ужо згаданыя *"Личные боевые счета партизан отряда имени Кутузова"*, то на старонцы 289 можна знайсці такі запіс:

"Лапидус Израиль Абрамович. Прибыл в отряд в апреле 1942 года. Командир отряда".

На асабістым баявым рахунку гэтага камандзіра ніводнага (!) забітага немца, ніводнага ўдзелу ў аперацыях!


Магчыма, пазнейшы камандзір атрада Яворскі (ці хто іншы), калі перадаваў справы атрада ў архіў, падстрахаваўся ад магчымага абвінавачвання ў скажэнні спрваздачнасці і дапісаў усіх тых, хто ў той ці іншы час уваходзіў у склад атрада. Не выключана, што дапіска зроблена з надзеяй атрымаць пазнейшыя дывідэнды ад удзелу ў партызанскім руху. Сярод дапісаных маюцца прозвішчы як беларусаў, так і жанчын яўрэек.

DRAZNO

ЯНЫ КІРАВАЛІ СПАЛЕННЕМ ВЁСКІ



Ініцыятар «штурма» Дражна, малады камандзір 2-й Мінскай партызанскай брыгады, ленінградзец Сяргей Іваноў.



Адказны выканаўца «зачысткі» Дражна камандзір атрада імя Кутузава 2-й Мінскай партызанскай брыгады Ісраэль Лапідус.

партызанаў атрада імя Кутузава (камандзір атрада Ізраіль Абрамавіч Лапідус), якія 14 красавіка 1943 года прымалі ўдзел у штурме паліцэйскага гарнізона вёскі Дражна Старадарожскага раёна (на падставе баявых рахункаў партызан гэтага атрада)

Агинский Ефим Самуилович
Ажаронок Василий Алексеевич
Ананич Петр Власович
Ананьев Сергей Сергеевич
Анохин Степан Степанович
Арземанов Арсен Ефремович
Ахремчик Михаил Демьянович
Баек Сергей Захарович
Баранов Павел Филиппович
Баркун Николай Кондратьевич
Бачило Петр Захарович
Безобразов Гавриил Харитонович
Бельский Николай Михайлович
Билейчик Владимир Денисович
Боровик Севастей Константинович
Борушанский Семен Борисович
Варивончик Николай Игнатьевич
Виноградов Михаил Васильевич
Воробьев Григорий Абрамович
Гаев Владимир Петрович
Гантман Абрам Самуилович
Гридчик Михаил Степанович
Гришук Николай Михайлович
Гуревич Леонид Григорьевич
Гуринович Иван Михайлович
Гутцайт Вениамин Аронович
Доманов Владимир Власович
Дукорский Григорий Лейбович
Евсюнин Дмитрий Иванович
Журик Александр Васильевич
Зицгольц Арон Лейзерович
Калинин Николай Арсеньевич
Калитвинцев Николай Кириллович
Капчик Михаил Самуйлович
Карпилович Александр Валерьянович
Кашкан Антон Филиппович
Кирильчик Александр Иванович

DRAZNO

Кожемяченко Степан Иванович
Колодяжный Алексей Григорьевич
Кондагуров Григорий Федорович
Кононова Елена Иосифовна
Костевич Александр Иванович
Кохан Степан Моисеевич
Крук Гавриил Климентьевич
Курьянович Адам Яковлевич
Курьянович Петр Петрович
Лапидус Михаил Рафаилович
Лапидус Семен Абрамович
Лариков Митрофан Артемьевич
Леднев Степан Потапович
Лобанок Михаил Артемович
Лосик Лазарь Владимирович
Макеев Федор Борисович
Мотуз Денис Федорович
Мотуз Александр Ильич
Наумчик Александр Иванович
Никольский Анатолий Дмитриевич
Парников Дмитрий Ефимович
Пензий Виктор Максимович
Пискун Алексей Иванович
Плыженков Николай Афанасьевич
Покарский Золя Шмеерович
Пранович Иван Савельевич
Працкевич Константин Аксенович
Равнейко Владимир Петрович
Радкевич Иван Игнатьевич
Резник Наум Борисович
Роговский Владимир Иосифович
Розанов Владимир Владимирович
Рубинсон Калман Янкелевич
Русецкий Иосиф Станиславович
Рыбак Степан Андреевич
Савенко Павел Акимович
Сапун Леонид Федорович
Свирский Яков Натанович
Сезень Николай Иванович
Сенько Александр Борисович
Сигутин-Язьмир Рувим Цадокович
Сипач Макар Борисович
Скотников Виталий Петрович
Сороко Яков Александрович
Титов Константин Агафонович
Ушаков Константин Иосифович

Фельдман Григорий Моисеевич
Федоров Иван Евдокимович
Федотов Иван Тимофеевич
Халявский Абрам Борисович
Хименко Александр Васильевич
Хурсик Михаил Николаевич
Цакулов Владимир Константинович
Цегельник Василий Никитович
Цыганович Александр Матвеевич
Черник Эдуард Иванович
Чеховский Николай Яковлевич
Чешко Павел Иосифович
Чешко Петр Николаевич
Черный Федор Кузьмич
Шалман Рафаил Вениаминович
Шелег Аркадий Федорович
Шелег Владимир Данилович
Шелег Константин Малахович
Ширец Алексей Григорьевич
Шлопак Михаил Тимофеевич
Шнейдер Ефим Семенович
Шпак Петр Антонович
Энойч Лазарь Мотелевич
Юшкевич Николай Эдмундович
Юшкевич Феликс Фадеевич
Янкелевич Иосиф Копелевич

Фонд 4057, вопіс 1, справа 43



Адгаманіла 60-годдзе Перамогі. Аднак магіла на ўскрайку Дражна так і засталася безыменнай. «Могила 20 воинов Советской Армии и 7 партизан, погибших в 1943 г. при штурме полицейского гарнизона» напісаў невядомы аўтар на камяні. Ці то не ведаў, ці то наўмысна сказіў праўду?

Пасля першага выдання
кнігі прайшло тры гады.
Пошук працягваўся.
Былі адшуканы новыя
дакументы і сведкі
злачынства

Успаміны

жонкі Героя Савецкага Саюза
Вітольда Міхайлавіча Гінтаўта
Гінтаўт Кацярыны запісаныя аўтарам на яе
кватэры ў Мінску ў снежні 2003 г.

...Маму пахараніла і ўжо не засталася ў другім трэсце, а пайшла ў першы трэст. Працавала ва ўпраўленні УМР-12 на вуліцы Янкі Купалы. Непадалёк і жыла.

Было гэта дзесьці ў шасцідзесятых. Прызначылі нам новага начальніка. Быў ён спакойны такі. Мо на другі ці трэці дзень яго прыходу паміж намі адбылася гутарка.

— Дзе былі ў вайну? — запытала я.

— На фронце і ў партызанах.

— А дзе ў партызанах? У нас жа падчас вайны яны пабілі многіх, спалілі паўвёскі.

— Былі ў Старадарожскім раёне, у Дражна.

Я ўсхапілася:

— У Дражна?

— А што такое?—здзівіўся ён.

— У мяне сяброўка была — Каця Пятроўская. Бацька яе ў партызанах быў. Яна таксама скрывалася, не начавала дома. Напярэдадні Вялікадня ёй наказалі, маўляў, пара перабірацца ўсёй сям'ёй у лес. Бяры маці, бяры брата і ідзіце да Залужскай канавы. Там сустрэнеш партызан, скажаш, што Пятроўскія ідуць у лес. Яна, бедная, так і зрабіла: пайшла неўпрыкмет на Вялікдзень дадому. На тое гора наляцелі партызаны, пабілі і спалілі жыхароў дражненскага Засценка, польскую шляхту, як тады казалі. І маю сяброўку таксама забілі.

Як я яму гэта сказала, гляджу — чалавеку на вачах дрэнна становіцца.

— Пайду ў бальніцу,— кажа.

— Ідзіце, ідзіце,— адказваю,—Тут жа трэцяя непадалёк.

Пайшоў.

У панядзелак мне ісці ў банк — патрэбны яго подпіс. Тэлефаную жонцы: «Скажыце, калі ласка, як пачувае сябе ваш муж?» «Ведаеце,— адказвае яна ціхім, перапужаным голасам,—цяжкае становішча... Ён пайшоў на паляванне. Вяртаўся, дрэнна стала. Прыйшоў дадому — і памёр.»

Для мяне ж ясна стала: гэта быў адзін з тых, хто паліў Дражна.

У час вайны я любіла варажыць. Напярэдадні таго, калі ў абоз паліцаі павінны былі каго забраць ці на іншыя якія работы, усе ішлі да мяне: "Кінь на карты, ці вернецца?" Казала праўду наперад на два-тры дні. Вось кінула карты Кацярыне і Валі Шамковай. «Ой,— кажу,— страшная карта. Нешта здарыцца і вы загінеце.»

Незадоўга да таго красавіцкага дня прыходзіла маміна сястра з Залужжа. Кажа: «Страшна неяк. Усё гэтыя баі без канца. Калі што — вы цераз могілкі да нас бяжыце».

Тады сны спраўджваліся.

Мне ж напярэдадні сніўся нейкі дзед. Быццам бы пачынаецца бой ля вёскі, а я іду ў Залужжа. І толькі перайшла ля могілак дарогу-гравейку, а гэты стары мне ў сне і кажа: «Вярніся, дзіцятка, куды ты ідзеш?» Я адказваю: «Да мамінай сястры ў Залужжа». «Дык нельга ісці — ты загінеш.» А я ў адказ: «Дык я цераз сенажаць...»

Калі 14 красавіка пачалася страляніна, мама хуценька выправіла мяне да цёткі. Толькі я прайшла палову дарожкі да могілак — раптам як нехта у спіну штурхануў: "Вярніся назад!" Я ўспомніла сон, вярнулася. Маці пытаецца: «Што здарылася?» «Дык сон жа быў,— кажу.— Стары мне наказаў не ісці. Заб'юць.»

І толькі я вярнулася — як з кар'ера, што быў на маім шляху, паднялася страляніна. Аказваецца там сядзела партызанская засада. Мы з маці паспяшаліся да ямы, што была выкапана на агародзе. Пры гэтым у бок Падарэсся на выган маці выгнала з хлява каня і карову. Бачым — ужо ля нашага дома партызаны! Яны заўважылі нас, але спакойна, дружалюбна так кажуць: «Куды ты, дурная цётка, жывёлу выпусціла, забяруць ў Падарэссі — не пабачыш». (Так яно пазней і сталася). Маці памкнулася завярнуць жывёлу, але партызаны параілі ёй за лепшае схавацца ў яме: «Не бойцеся, мы вас не кранём». І сапраўды ў нашым канцы вёскі ў час бою было ціха. Мы бачылі толькі, як з пачаткам шалёнай страляніны пачаў гарэць Засценак, як узвіліся языкі полымя над яго хатамі і вецер пачаў даносіць пах гары. «Божухны, што гэта там робіцца?»— углядаліся мы. Я памкнулася выскачыць з ямы, каб пабачыць усё на свае вочы, але партызаны, што знаходзіліся побач, параілі не высоўвацца і загадалі маці не выпускаць мяне.

Пасля таго, як Засценак быў спалены, партызаны спакойна адышлі, за імі ніхто не гнаўся, не рабіў пераслед.

Мы пайшлі глядзець на пажарышча. Цяжка перадаць, што там тварылася. Па тры-пяць чалавек загінула ў кожнай сям'і. Многія згарэлі зажыва.

З вынікамі «аперацыі», безумоўна, хлусня. Я добра ведаю, што ў вёсцы было пятнаццаць сваіх паліцаяў, астатнія — з Ляўкоў і іншых месцаў наваколля. Агульная колькасць іх была невялікай, некалькі дзесяткаў. Знаходзіліся ў вёсцы два хворыя немцы, якіх у хаце Кастуся Жукоўскага даглядала Шаплычыха (мужа яе за сувязь з партызанамі немцы ў Старых Дарогах павесілі).


Успаміны

былога сакратара Барысаўскага райкама партыі Мікалая Іванавіча Грыневіча, 1920 г. нар., запісаныя аўтарам у снежні 2003 года

У 1944 годзе нас з Крыма перакідвалі на 2-гі Беларускі фронт, давезлі да Магілёва, разгрузілі. Трэба было паклапаціцца пра харчаванне. Старшы лейтэнант Беліцкі, я і яшчэ адзін баец былі адпраўлены ў штаб фронта, каб стаць на харчовае задавальненне. Дарога была цераз Старыя Дарогі і я атрымаў згоду сяброў наведаць мой родны кут. Так хацелася пабачыць маці, абрадаваць яе тым, што жывы. У райцэнтры мы зайшлі да знаёмай. Яна мне паведаміла пра трагедыю, пра тое, што маму я ўжо ніколі не ўбачу, што яна згарэла... У адчаі ўжо ўначы я ірвануў ў Дражна, аднак замест дома пабачыў галавешкі і мацярыну магілку. Не перадаць пачуцця, з якім я вярнуўся ў часць...

СВЕДКА
WITNESS FOR THE PROSECUTION

Уладзімір Паўлавіч КОЛАС



Былы жыхар Дражна, малалетні вязень фашысцкага канцлагера Уладзімір Паўлавіч Колас, паказвае на месца, дзе 14.04.1943 партызанамі ў яме былі забітыя яго родныя. Дражна. 15 мая 2004 года.

Успаміны

Уладзіміра Паўлавіча Коласа з Гомеля
(дыктафонны запіс зроблены 3 лютага 2004 г.)

Я прачытаў кнігу «Кроў і попел Дражна». Як напісана, так усё і было. Я быў суседам Шамко Мілы. Жыў цераз адну хату ад іх сям'і.

Раскажу пра 14 красавіка.

У нас за плотам рос бэз і была выкапана яма, у якую бацька на зіму закопваў бульбу. Да вясны гэту бульбу выбралі, і таму яма была пустая. Вось там, у ёй [як пачалася страляніна], сядзелі: бацька мой, меншы брат, старэйшы брат, бежанцы [самленскія], суседзі Шамко Валя, Міла і Коля, мусіць, яшчэ хто (зараз усіх і не ўспомню). А мы з мацярай апынуліся ў склепе, затрымаліся, хацелі яшчэ нешта выратаваць з хаты. Я чуў, як забівалі. Людзі праціліся: «Не бейце, мы ж цывільныя людзі, свае, мы нічога вам дрэннага не робім. За што?» А яны: «Чаго медліш? Бей фашыстаў!» — і стралялі ў гэту яму... Гэта я чуў вельмі добра. Калі б мы з маці і з бацькам пайшлі, то таксама былі б забітыя.

Было мне тады трынаццаць гадоў. Пачалося гэта ранкам, сонца яшчэ толькі пачало ўзыходзіць. Працягвалася ж бойня гадзін да адзінаццаці дня.

Што яшчэ павінен зазначыць: не ўсе яны былі бандытамі. Былі харошыя. Я вам раскажу такі эпізод. Калі пачаў гарэць хлеў, дзе была карова і парасяты, мая маці памкнулася са склепа ратаваць жывёлу. Я стрымліваў яе. «Як жа мы будзем жыць! Кароўка згарыць. Як жа нам без яе?!» — кідалася яна, заламваючы рукі. І ўсё ж выскачыла. Наперарэз ёй два партызаны: «Куды, старя, бяжыш? Зараз мы цябе... Ідзі хавайся, не то заб'юць». А яна: «Вой жа, сыночкі, кароўку трэба выпусціць, кароўка згарыць!» Яны ёй дапамаглі адчыніць хлеў, карову выпусцілі, падсвінка вынеслі. Знак роўнасці паміж забойцамі і сапраўды партызанамі нельга ставіць. А забойцаў належала і належыць пакараць. Гэта маё асабістае перакананне.

Калі партызаны наступалі зімою 15 студзеня, тады ніводнага паліцэйскага не забілі. 14 красавіка забілі аднаго толькі — начальніка паліцыі. І то выпадкова. Казалі, ён з дзота выскачыў і быў забіты шалёнай куляй. А там пішуць, што пабілі столькі паліцэйскіх! Усё гэта, хлусня!

Потым партызаны пайшлі назад. Каго сустракалі — дабівалі. Бежанку ўбілі і яшчэ Івана нейкага, я яго не

вельмі памятую. Памятую, што быў такі, але прозвішча не ведаю. Яго забілі і яшчэ боты сарвалі.

Яны наступалі з двух бакоў: са Старых Дарог і з другога боку, ад сяла. Там нікога не забівалі, не палілі нічога, а на нас пайшлі нейкія гады горш жа за акупантаў. І што самае крыўднае, што палілі тых, хто абсалютна невінаваты. Ва ўсіх была нейкая радня: ці то зяці у Савецкай Арміі, ці то сыны на фронце. Вось майго бацьку забілі, а сын жа яго старэйшы быў у Чырвонай Арміі, усю вайну прайшоў. За што іх паўбівалі, за што?! Вось што крыўдна! Калі б нейкую віну адчувалі перад партызанамі, перад Савецкай уладай, а то мой бацька так перажываў за гэтых партызан, за нашу армію, за становішча на фронце. Ён жа ў паліцыі не быў. А яго забілі! За што?!

Субцэльны Мікіта быў заядлы паліцай, начальнік раённай паліцыі. У гэты час ён не быў у вёсцы. Прыехаў і кажа: «Я давольны, што пабілі. Вось вам — вашы партызаны! Мы ж гаварылі вам: "Бярыце зброю! Вось вам вынік, камуністы. Так вам і трэба!» — хадзіў усё, качарыжыўся. Гад...

СВЕДКА
WITNESS FOR THE PROSECUTION

Віктар Паўлавіч КОЛАС



Успаміны

Віктара Паўлавіча Коласа з Гродна,
нар. у 1933 г.

Калі наступалі партызаны мы сядзелі ў яме. Восем чалавек. Дык яны спачатку бросілі нямецкую гранату, такую длінную, з дзеравяннай ручкай. Бацька быў ваенны, гранату выбрасіў у другую сторану. Яны прыбяжалі да нас. Мы гаворым: «Хлопцы, вы што, не відзіця? Мы ж грамданскія людзі! Ну яны астанавіліс. А какой та ў чорнай куртке-кожанке падбяжаў з дзесяцізарадкай: «Ну, што вы?!» — і начаў страляць. Ну яны пальнулі

і пабяжалі. Дык убілі майго атца. Там ешчо саседзі былі нашы (два брата і дзве сястры). Дык два брата ўбілі і старшую сястру, а младшую ранілі. А я свайго брата накрыў курткай — дык мы нічога. Саседзі накрылісь (маладажоны былі). Дык жану ўбілі, а ён астаўся жыў.

Ну яны пабяжалі. А мой старшы брат дык усё галаву высоўваў. «Ага, вы там яшчэ жывыя? Ну вот, вылазь!» — Яго выцягнулі і мяня і палажылі там на броўке, на полі, спецыяльна... Дык брат паціхоньку адпаўзаў, адпаўзаў — і даў дзёру. Яны: «Стой! Стой, страляць будзем...» Але, праўда, не стралялі. І я паціхоньку пабег следам за братам. Удраў. Яны, праўда, не астанаўлівалі.

Хто дома застаўся — убілі кагда адступалі назад. А кагда наступалі — убілі двоюраднага брата бацькі. Ён з дзевачкай ляжаў у яме, з трохлетняй. Дык яго убілі, а дзевачка чудам асталася жывой...

А дальша, када яны наступалі, жыў Парахня. Была там дзевачка 15 лет, красівая. Яна памагала цёткам. Дык яны хацелі ўбіць эту дзевачку, панімаеце? Цёткі зашчышчалі. Дык убілі і цётак, і дзевачку эту. Эта былі сволачы!

З другой стараны дзярэўні, за школай, там ніхто не пастрадаў. На Засценак казалі — шляхта, а там — сяло. У Засценак перасяліліся з Дзяржынскага раёна, памешчык ім зямлю прадаў.

Дзярэўня больш пастрадала ад эціх парцізан, чым ад немцаў. Кагда [паліцэйскі] гарнізон уйшоў ніхто і не знаў. А эці негадзяі прыйшлі — сажглі школу, пошту, клуб. Эта сволачы...

З паліцэйскіх у той дзень [14.04.1943] пастрадаў толькі начальнік паліцыі. Быў Дабравольскі такой таварыш. Хадзіў, к каждаму падхадзіў пазнакоміцца, разгаварываў. Очэнь прыятны таварыш. Дзяцей сабіраў у сельсавет, іграў на пацефоне. Дык ён захацеў пасматрэць, што за парцізаны? У бінокаль сматрэў. Дык яго мінай (у амбразуру папала) і ўбіла. А так ніхто не пастрадаў...

Я гавару то, што мы ва врэмя вайны пастрадалі два раза. Немцы прыйшлі — карову забралі таму, што брат быў у ваенкамаце ваенкомам, камісарам (нехта падказаў). Потым, кагда асвабадзілі ў 1944-ым, прыйшлі парцізаны і тожа карову забралі.

DRAZNO

СВЕДКІ
WITNESSES FOR THE PROSECUTION



Трагедыя прайшла праз іх лёс. Жыхары Дражна, якія страцілі родных падчас спалення вёскі. Злева направа: (сядзяць) Уладзімір Паўлавіч Колас, Людміла (Міла) Панасевіч, яе муж Уладзімір Панасевіч, даваенны ваенком Старадарожскага раёна франтавік Міхаіл Шамко (14.04.1943 г. партызаны забілі яго бацьку), Шыбко Алеся Андрэеўна.

Другі рад (стаяць): жонка Міхаіла Шамко Алена, Любоў Шамко, сын Міхаіла Шамко Уладзімір, маці Міхаіла Шамко Адрэта Паўлаўна.

Пасляваенны здымак.



Жыхарка Дражна Валянціна Лявонаўна Колас не памятае бацьку. Ёй было ўсяго тры гады, як яго забілі партызаны.

Дражна. 15 мая 2004 г.

БОЕВОЙ ПРИКАЗ № 35

Противник силою до 230* чел., состоящий главным образом из полиции, расположен в зоне, которая необходима партизанам для более успешной диверсионной работы на важнейшей коммуникации врага шоссейной дороге Бобруйск—Слуцк. Изменники Родины, засевшие в Дражно, неоднократно устраивая засады на мелкие группы партизан, выполняющих боевые и хозяйственные задачи, отрядам нанесли несколько потерь. Чтобы отмстить подлому врагу, смести его с лица земли

ПРИКАЗЫВАЮ:

15.4.43 гарнизон Дражно разгромить. Наступление поддерживают 2-е 45 мм пушки бригады имени Суворова. Наступление вести с двух сторон, двумя эшелонами. Со стороны Левки и Подоресье в 1 эшелоне наступать отряду им. Ворошилова, *во 2-м эшелоне отряду им. Кутузова*. Со стороны Язвино—Залужье наступать в 1-м эшелоне отряду «Чапаева», во 2-м эшелоне отряду им. Суворова. Отряду «Сокол» устроить засаду со стороны Старых Дорог на высоте 162,6 с задачей недопустить подкрепления; по остальным дорогам засады делает бригада имени Суворова.

Задача 1 эшелона уничтожить огневые точки противника, ворваться в гарнизон и разгромить.

Задача 2 эшелона проверить дома, подвалы, сараи, *произвести полную чистку в деревне (выдзелена мною — В.Х.)* от оставшихся, спрятавшихся полицейских и в случае задержки в продвижении 1 эшелона оказать помощь.

Исходные пункты показаны на схеме.

Быть в исходном пункте к 4.00 15.4.43 г., начало наступления после огня артиллерии, но не позже 5.00 15.4.43 г.

Я наступаю с отрядом имени Чапаева, комиссар с отрядом Сокол в засаде, нач. штаба Тищенко наступает с отрядом Ворошилова. Отход по сигналу две белые ракеты.

Комбриг *Иванов,*
комиссар *Михайлов,*
нач. штаба *Тищенко.*

Фонд 3500, вопіс 4, справа 149, аркуш 9

* *Лічба 200 чарнілам выпраўлена на 230.*

Каментарый да загада № 35

Звернем увагу на тое, што пры такой фармулёўцы загад № 35 загадзя быў невыканальным. Размяшчэнне агнявых кропак у вёсцы не канкрэтызавана. Відавочна разведка перад наступленнем увогулле не праводзілася. На які цуд разлічваў малады камбрыг Іваноў цяжка сказаць. Перш чым выкарыстоўваць артылерыю ён павінен быў мець хоць бы якое ўяўленне аб далечыні палёту снарада (як потым высветлілася — снарады не даляталі да вёскі). Атрады спазніліся. У час бою ніхто не спяшаўся савацца пад кулі паліцэйскіх дзотаў. Затое другі эшалон, у якім быў атрад імя Кутузава, з задачай «полной очистки в деревне» справіўся «бліскуча»: Засценак быў спалены ўшчэнт.

Адзначым блытаніну з датай трагедыі. У згаданым дакуменце датай аперацыі пазначана ***15 красавіка 1943 года*** *ў той час, як наступны дакумент сведчыць, што спаленне адбылося* ***14 красавіка 1943 года.*** *Дзе ж праўда? Што адбылося раней: складанне акта вынікаў аперацыі ці сама аперацыя?*

Белорусский штаб партизанского движения

Секретно

Вх.№ 2351 17.08.1943

АКТ

14 апреля 1943 г. мы, нижеподписавшиеся в составе: командира 2-й Минской Красно-Партизанской бригады, комиссара — Михайлова, нач. штаба — Тищенко, нач. особого отдела НКВД — Безуглова при участии командиров отрядов, комиссаров, нач. штабов отрядов: «Сокол», «Ворошилов», составили настоящий акт о нижеследующем.

Сего числа произведен разгром полицейского гарнизона Дражно и засада по дороге Залужье—Шапчичи, уничтожено 217 полицейских и их укрепленные здания. Полностью уничтожена автомашина, убито 16 полицейских, один немец, один шофер доброволец, одна шпионка, один нач. отдела труда. Забрано трофей: 7 винтовок, 1 пистолет, 250 патронов, сапог 2 пары, ботинок 3 пары а также убито 3 полицейских, взято 14 коров, 9 овец, один кабан, сожжен дзот, в нем 6 полицейских и 30 дворов их семей.

О чем и составлен настоящий акт.

Командир бригады Иванов (Подпись),
нач. штаба Тищенко (Подпись),
нач. ОО НКВД Безуглов (Подпись),

командир отр. «Сокол» Леонов (Подпись),
комиссар Жабин (Подпись),
начальник штаба Нестеров (Подпись),

командир отряда «Ворошилов»
Мысник (Подпись),
комиссар Крайко (Подпись),
начальник штаба Гиро (Подпись).

Примечание*: число убитых 217 является неточным, потому, что точно установить не удалось в связи с конспирацией противника, прибывшие на подкрепление соединения войск СС способствовали этому. Действительность от нашей войсковой и агентурной разведки была скрыта. Эти сведения и данные получены от 2 граждан с дер. Великий Бор 4-мя днями позже. В это же число входят убитые и расстрелянные семьи полицейских.

Фонд 3500, вопіс 4, справа 149, аркуш 316

Каментарый да стар. 83

**Заўвага дадрукавана пасля подпісаў, што недапушчальна з пункту гледжання афармлення дакументаў такога кшталту. Шрыфт машынкі асноўнага дакумента і заўвагі адрозніваецца. Відавочна з вынікамі дражненскай бойні ў аўтараў «акта» узніклі праблемы.*

Чаму ў яго складанні не ўдзельнічала кіраўніцтва атрада імя Кутузава? Чаму акт аб выніку правядзення «буйнейшай партызанскай аперацыі» трапіў у Беларускі штаб партызанскага руху толькі ў жніўні, праз чатыры месяцы пасля яе правядзення? Чаму не перадалі яго ў штаб сакратар Рудзенскага падпольнага камітэта партыі Глебаў ці камандзіры 2-й Мінскай партызанскай брыгады, допыты якіх адбыліся ў Маскве яшчэ ў чэрвені?

Дакументы пацвярджаюць меркаванне аб тым, што каты Дражна рабілі ўсё магчымае, каб праўда пра спаленне вёскі не выйшла за межы партызанскай зоны. Аднак праз год, у 1944-м брыгадай і атрадамі ўжо камандавалі іншыя людзі. Калі надышла пара «маляваць» подзвігі і здаваць справы ў архіў, яны справіліся з сваёй задачай больш-менш сумленна, пакінуўшы нам наступны дакумент.

РАЗГРОМ ПАЛІЦЭЙСКАГА ГАРНІЗОНА Ў ВЁСЦЫ ДРАЖНА

Рассветало. Колонна партизан подходила к гарнизону. Утренний апрельский, еще холодный, туман поднимался к облакам.

Послышались артиллерийские залпы. До гарнизона оставалось 1—1,5 км. Отряды приняли боевой порядок и двинулись на д. Дражно. Враг был разбужен артиллерийской стрельбою и был в недоумении. Снаряды до деревни не долетали. Падали и рвались в 200—300 метрах. Но услышав шум и крик партизан, наступавших с разных сторон, враг занял подготовленные к обороне сооружения и открыл огонь. Наступающие партизаны открыли ураганный огонь и с криком «Ура» выбили противника из нескольких дзотов, окопов и ворвались в деревню. Расстреливали с расстояния и в упор не успевших убежать в дзоты школы полицаев. Враг оставшийся в домах и сараях отстреливался, такие дома и сараи поджигались, от них зажигались другие и через 10—15 минут в огне пылали все дома того конца деревни, с которого наступали партизаны отряда Чапаева и отряда Суворова.

Подходили к школе отважные подрывники отряда Суворова Клименко, Назаров, Ефременко и др. забрались на крышу предпоследнего дома к школе и с пулемета вывели из строя расчет станкового пулемета врага.

Противник, засевший в школе не сдавался, вел ожесточенный огонь по хорошо пристреленному месту. Мин не было. Стрельба велась только из пулеметов и винтовок. Враг, зарытый в землю, за колючей проволокой нашим оружием был почти не уязвим.

Зажигательными пулями зажигались и последние постройки. Укрываться в деревне было негде, огонь вытеснял в поле, на открытое место где партизаны от пуль врага несли потери. Продолжать движение дальше было нецелесообразно. Командование приняло решение отойти. Бригада отошла, не выполнив поставленной задачи по разгрому гарнизона*.

В результате налета на гарнизон было убито 217 человек полицейских, немцев и их прислужников. Взято более 50 голов рогатого скота, несколько лошадей. Взято 8 человек в плен.

Потери партизан: убито «6» человек, ранено «12» человек**.

Операция по разгрому гарнизона для врага была неожиданной. Крупными силами партизан, которые участвовали в бою, их смелостью враг был ошеломлен. После отхода партизан, оставшиеся полицейские пытались бежать в гарнизон Старых Дорог, но прибывшим подкреплением немцев из Старых Дорог были задержаны.

Население окружающих деревень приветствовало проходивших партизан. Выносило на улицу хлеб, молоко, яички, сало и другие продукты. Народ радовался боевым успехам народных мстителей и желали полного истребления фашистских слуг, засевших в гарнизоне Дражно. После этой операции десятки новой молодежи, окружающих деревень ушли в партизаны.

Из этой операции следует вывод:

1) Примененная артиллерия вела огонь с далекого расстояния и не только помогла разбудить гарнизон, а прежде времени привела врага в боевую готовность не причинив ему никакого вреда и морального воздействия.

2) Отряды подошли к деревне когда было совсем светло. Нужно подходить до рассвета, а с рассветом атаковать гарнизон.

3) Отряды шли сплошной цепью, фронтом в две линии. Лучше иметь группы, имеющие задачей уничтожить опреде-ленный опорный пункт, окоп или какую-либо другую огневую точку.

Сплошная цепь несла потери, командиры командовали «вперед», но кто должен повести первый своих людей на дзот этого не было.

4) Для уничтожения врага, закопанного в землю, нужны минометы, пушки и чтобы бить прямой наводкой или же нужно иметь людей подготовленных к переходу в партизаны, которые смогут обеспечить пропуск группы партизан с автоматами в свое расположение и враг, застигнутый врасплох, будет разгромлен.

Командир 2 Минской Красно-Партизанской бригады (МКПБ) капитан Андреев.

Комиссар бригады, батальонный комиссар Ванкевич.

Начальник штаба бригады капитан Раткевич.

Фонд 3500, вопіс 4, справа 149, арк. 316

---

* *Дык пра які ж разгром гарнізона пісала «Советская Белоруссия»?*

** *Лічбы ўпісаны ад рукі чарнілам.*

DRAZNO

СХЕМА АПЕРАЦЫІ

(копія)



Фонд 3500, вопіс 4, справа 149а, арк. 10.

Каментарый да стар. 85–87

Заўважым, што як апісанне аперацыі (дакумент на стар. 85, 86), так і схема (на стар. 87), складаліся пасля вызвалення і былі скіраваны на пацверджанне «бліскучасці» аперацыі. Між тым распрацавана яна была бяздарна. Пры штурме партызаны панеслі страты. Падабрацца да дзотаў пад прыкрыццём дамоў Засценка не ўдалося. Пры набліжэнні да дзотаў партызан сустракаў кінжальны агонь паліцэйскіх кулямётаў. Не дала эфекту і стралянінa з гарматы. Спаліўшы Засценак, партызаны забралі хатнюю жывелу і спакойна адышлі. Ніхто за імі не гнаўся.

Ёсць падставы меркаваць, што праўда пра бойню ў Дражна дайшла ўсё ж і да Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР). Летам 1943 года ў Маскву былі выкліканы на допыт-«размову» сакратар міжраённага падпольнага камітэта партыі ***Глебаў****, начальнік санітарнай службы брыгады* ***Пятровіч*** *(6.06.1943, ён знаходзіўся на лячэнні ў Маскве, таму быў дапытаны адным з першых), камандзір атрада «Сокал»* ***Дамажыраў*** *(15.06.1943), камандзір брыгады* ***Іваноў*** *(19.08.1943) і іншыя.*

Зыходзячы з зместа дакумента, што змяшчаецца на наступнай старонцы, лёгка заўважыць, што «беседа», пасутнасці, з'яўлялася допытам. Пры гэтым следчага на ўсіх «беседах» цікавіла адно і тое ж: характарыстыка ўнутранага стану брыгады і наладжанасць ў ёй разведвальнай работы. Відавочна вывучаліся прычыны, што прывялі да трагедыі.

БЕСЕДА

секретаря Руденского подпольного РК КП(б)Б
Федора Васильевича Глебова
со старшим помощником начальника
2-го отдела БШПД капитаном Коссым

16.06.1943.
Станция Сходня Московской области

Коссой: *«Охарактеризуйте внутренее состояние 2-й Минской бригады, какие там есть наиболее серьезные болезненные явления? Меры борьбы с этими явлениями.»*

— Бригада сформирована в сентябре 1942 года. К моменту организации в ней насчитывалось 340 человек. Месяца через полтора она выросла до 1000 человек, к новому году — до 1500. Сейчас без отрядов, которые мы передали Покровскому, насчитывает 2100—2200 человек, и передали мы ему человек 500.

Вначале бригада объединяла 4 отряда, затем — 5. Постепенно были созданы 6, 7, 8 отряды, а также 9-й, состоящий из местных крестьян деревни Горелец.

Когда деревню Горелец сожгли, к нам в бригаду пришли 5 крестьян и сказали, что хотят организовать местный партизанский отряд для несения караульной службы, охраны и, если нужно будет, для боевых действий. Мы выделили им командира, комиссаром — т. Покуна.

... Несмотря на всю проводимую нами работу, семья оказалась не без урода, имеются недостатки. Одним из крупных недостатков, не изжитых до сих пор, является мародерство, которое исходит главным образом от партизан местных. Эти партизаны бывая на хозяйственных операциях незаконно отбирают костюмы, сапоги и другие вещи и прячут у себя дома. Мародерство наблюдалось также, как результат пьянства. Бывали случаи, когда партизаны забирали в одной деревне лошадей, а в другой продавали за самогонку.

... В отношении к виновным принимались самые строгие меры. За мародерство и бандитизм расстрелено 9 человек.

Коссой: *«Не было ли фактов попустительства мародерам со стороны командного состава бригады и отрядов?»*

— Со стороны командирского состава бригады не наблюдалось, что нельзя сказать относительно командиров отрядов. Например командир отряда имени Кутузова *Лапидус лично давал распоряжения забрать швейную машинку, последнюю свинью, курицу (выдзелена мню — В.Х.).* Поскольку боец получает задание командира, он старается его выполнить и в таких случаях почти всегда перегибает.

Во 2-м отряде по заданию командира бойцы доставили костюм, сапоги, разные женские вещи. Такие приказания со стороны командира привели к тому, что боец требует — давай и не смотрит, последнее это у крестьянина или нет. Командира отряда Тарасова мы за это крепко предупредили и объявили выговор. Это не помогло и впоследствии он был расстрелян.

Болезненным явлением было и сейчас есть — злоупотребление самогонкой. Это наблюдается не только со стороны бойцов, но и отдельных командиров. Например начальник штаба бригады Тищенко неоднократно напивался до такого состояния, что просто дискредитировал командование отряда перед партийным руководством. В то время у нас был член межрайонного партийного центра Паромчик (Суворов). Тищенко в пьяном виде наскочил на Паромчика, чуть не сбивая его с ног.

На почве пьянства Тищенко связался с несколькими женщинами одновременно, что привело к бытовому разложению. Женщины между собой передрались и Тищенко был окончательно скомпроментирован. Тищенко объявили строгий выговор с предупреждением и поставили вопрос перед командованием о немедленном снятии с должности начальника штаба бригады...

В отношении с женщинами неблагополучно не только с Тищенко, но и с некоторыми другими командирами, в том числе и с командиром бригады. Есть случаи, когда командиры женились по три раза, например командир бригады. Комиссар бригады также женился не смотря на то, что у него в тылу противника есть семья.

С комиссаром отряда «Сокол» Жабиным был такой случай. В распоряжение особого отдела бригады поступила одна девушка подозревая в том, что она агент гестапо. В процессе разработки на нее был собран довольно солидный материал по которому ее следовало расстрелять. Пока шло следствие, девушка находилась под охраной в первом отряде. С ней связался Жабин и так тянулось недели две. Однажды Жабин пришел в особый отдел и заявил: «Она честная девушка, расстреливать ее не за что. Если вы мне доверяете я дам расписку и она будет работать медицинской сестрой.» Командир и комиссар обсудили и

DRAZNO

решили согласиться. Она проработала несколько месяцев. Жабин женился и жил с ней по апрель месяц. Она, будучи женой Жабина, занималась разложением бойцов, это выражалось в бытовой распущенности. Потом, будучи в апреле месяце в Руденском районе, я узнал, что жена Жабина расстреляна по мотивам бытовой распущенности и на основании дополнительных материалов. Поскольку Жабин был членом Минского сельского райкома партиии, в прошлом политрук, я весь материал передал на обсуждение Минского сельского райкома партии. В то время там присутствовал член межрайонного партийного центра Паромчик. Насколько мне известно, Жабин выведен из состава райкома и ему объявлен строгий выговор.

Коссой: *«Вы, как секрктарь райкома сами беседовали с ними — командиром и комиссаром бригады на эту тему? Чем они объясняют такие явления?»*

— Об Иванове мы обсуждали на заседании райкома партии и серьезно предупредили. Это было в декабре 1942 года. Иванов заверил райком, что больше таких явлений у него с женщинами не будет. Теперь он живет хорошо с последней женой; воюет неплохо.

Коссой: *«Насколько соответствует своему назначению командно-политический состав?»*

— В основном командно-политический состав подобран неплохой и с возложенными на него задачами, которые ставятся сейчас перед партизанскими отрядами, справляется.

Боевая деятельность за последнее время свидетельствует, что командиры способны руководить отрядами и вести их в бой. Как, например, можно привести последнюю операцию, осуществленную в апреле месяце по разгрому вражеского гарнизона. Инициатором разгрома являлся командир партизанской бригады.

Прежде всего была проведена тщательная разведка по направлению гарнизона, разработана схема наступления на гарнизон, а также распределены огневые средства. Во время боя отряд Чапаева, например, действовал исключительно хорошо. Несмотря на сильное сопротивление противника, через 15—20 минут после начала боя партизаны ворвались в населенный пункт и в течение 2,5 часов вели уличные бои. Наши потери 7 человек* раненых и 3 убитых. Разведка донесла, что после боя в гарнизоне противника, насчитывавшем 230 человек, осталось 65—70, остальные были убиты, задохнулись в подожженых укреплениях и часть убежала.

Коссой: *«Как строятся взаимоотношения подпольного райкома партии с бригадой и отрядами?»*

— ...После окончательной обработки плана операции командир и комиссар приходят в райком партии, ставят в известность... представляют разработанный план и согласовывают с секретарем райкома. Больше того, члены райкома, даже я сам, участвую почти во всех боевых операциях...

Однажды в расположение деревни, где находился наш отряд, прибыла автомашина на которой приехали евреи из гетто. Мы спрашиваем, каким образом они попали в партизанский отряд? Они говорят: «Нам стало известно в гетто через таких-то людей, что в этом районе действуют партизанские отряды. Мы за золото купили машину, купили пропуск на эту машину и решили ехать. Когда их стали разрабатывать, многие путались. Некоторые даже в гетто никогда не были, роботали переводчиками, в госпиталях. Правда, их разоблачить к моему отъезду не удалось, какие результаты их разработки я не знаю, но во всяком случае есть подозрение, что в числе приехавших есть шпион. Всего приехало около 20 человек**.

...Гестапо практикует вербовку своих агентов в населенных пунктах где расположены партизанские отряды. Вербуют через бургомистров и местных полицейских. Намеченных к вербовке немцы вызывают в определенный райцентр или гарнизон и там обрабатывают. Например, немцы вызвали одну девушку, обработали ее и дали задание пойти в партизанский отряд, вернее в район действия партизанского отряда, выявить количество партизанских отрядов, их расположение, вооружение и через две недели вернуться в Старые Дороги и доложить. Она прошла через деревни Кошели, Владимирово, Прудок. Нам она сказала, что вчера пришла из Старых Дорог. Ее рассказ вызвал подозрение. Девушку арестовали, начали допрашивать. Она призналась, что сидела в полиции, ее вызвали и предложили пойти на задание. Девушка согласилась. В полиции ей сказали, что существует 5-й отряд *еврейский (выдзелена мною — В.Х.)*, 4-й отряд, 3-й. Другими сведениями о количестве отрядов полиция не располагала и попросила девушку выяснить. По окончании следствия она была расстреляна...

Фонд 3500, вопіс 4, справа 188, арк. 115—118.

** Размова ідзе пра аперацыю спалення Дражна. Пры гэтым сакратар падпольнага райкама партыі ці не ведаў рэальных абставін бою, ці проста ў вочы хлусіў асабісту. Названыя ім лічбы ніяк не стыкуюцца з фактычнымі і нават з тымі, што даводзіў камбрыг Іваноў.*

*** Відавочна, размова пра прыход у атрад групы Лапідуса (гл. стар. 37).*

ПАКАЗАННІ

камандзіра атрада «Сокал» Дамажырава, дадзеныя старшаму памочніку начальніка 2-га аддзела БШПР капітану Касому (15.06.1943):

Наиболее отрицательными явлениями в жизни и работе бригады были факты «женитьбы» командного состава, что приводило к нарушениям этики. В ноябре месяце 1942 года был издан приказ о том, что начиная со среднего командира и выше разрешалось жениться согласно приказа Наркома и считать жену своей боевой подругой, которая бы с оружием в руках вместе сражалась со всеми бойцами против оккупантов. Этот приказ проработали с командным составом. Каждый командир стал подбирать себе жену. Стали проситься съездить в деревню, где есть знакомая девушка. Если в этом отказывали получалось недовольство со стороны командного состава. Были случаи, когда женится тот или иной, а потом прогоняет жену. Она пускается в разврат. Это все отражалось на воинской дисциплине и работе бригады...

...Пятый отряд, где командиром Лапидус имеет ряд фактов провала боевых операций...

Фонд 3500, вопіс 4, справа 188.

Камандзір атрада «Сокал» Васіль Дамажыраў на допыце зазначыў, што начальнік штаба брыгады Цішчанка пэўны час з'яўляўся камандзірам нацыянальнага яўрэйскага атрада.

Нягледзячы на разборкі ў Маскве ніхто з камандавання брыгады за ўчыненае злачынства не быў пакараны. Калі не лічыць, што большасці партызанскіх камбрыгаў, якія дзейнічалі ў Мінскай вобласці, было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, а камандзіру 2-й Мінскай партызанскай брыгады Іванову — не.

Пасля вайны Іваноў працаваў старшынёй калгаса, пазней узначаліў Рудзенскі завод пластмасавых вырабаў. У 1975 годзе ён застрэліўся.

У гісторыі атрада імя Кутузава (ф. 3500, вопіс 4, аркушы 110—121, машынапіс), якую 1 жніўня 1944 года падпісалі камндзір атрада Калітвенцаў, камісар Абрамаў і начальнік штаба Арлоў, аперацыя па «штурму» Дражна нават не згадваецца.

Не ўдалося яе адшукаць і ў кнізе вядомага і аўтарытэтнага знаўцы партызанскага руху на Міншчыне Канстанціна Ілліча Дамарада.*

У адносінах да Дражненскага гарнізона ён пакінуў наступныя радкі:

"Оккупационные власти создали в д. Дражно, в 15 км от райцентра Старые Дороги, крупный гарнизон для борьбы с партизанами. На него был возложен контроль за окружающими деревнями, подходами к Старым Дорогам и Варшавскому шоссе. Состав гарнизона комплектовался полицейскими и солдатами «добровольческих» формирований с включением в него военнослужащих из немецкой жандармерии, охранных и эсэсовских частей. К половине июля 1943 г. он насчитывал 365 человек, имел на вооружении 4 станковых и

* *Доморад К.И. Партийное подполье и партизанское движение в Минской области,* 1941-1944. */Под ред. И.И.Игнатенко.—Мн. Навука і тэхніка, 1992.*

12 ручных пулеметов, винтовки, артиллерию и располагался в 36 дзотах и блиндажах, соединенных между собой ходами сообщений. Опасаясь нападения партизан, гарнизон не выходил из своих укрытий ни днем, ни ночью, за исключением участия в карательных операциях в составе других частей. Подступиться к гарнизону было не просто. Командование 100-й партизанской бригады им. С. М. Кирова решило уничтожать группы этого гарнизона из засад, когда они еженедельно вынуждены были выезжать из Дражно в Старые Дороги за получением продуктов. И когда очередная группа солдат и офицеров гарнизона в количестве 60 человек отправилась в Старые Дороги, партизаны трех отрядов (общей численностью до 200 бойцов) 16 июля 1943 г. устроили на дороге засаду. В течение внезапного 40-минутного боя убито 33, ранено 18 полицейских и немецких солдат. В качестве трофеев партизанам досталось два ручных пулемета, 15 винтовок, 5 тыс. патронов и три подводы с обмундированием. После этой боевой операции ряды полицейских, мобилизованных гитлеровцами в некоторых окрестных деревнях, стали редеть — при первом удобном случае они стали оставлять гарнизон".

Канешне, былы намеснік камандзіра Барысаўска-Бягомльскага партызанскага злучэння Дамарад не мог не ведаць пра трагедыю Дражна. Дзякуй яму за тое, што ў адрозненне ад папярэднікаў ён не стаў узводзіць трагедыю ў ступень геройства і проста прамаўчаў пра злачынства.

Напярэдадні святкавання 60-годдзя Перамогі аўтару пашчасціла сустрэцца з легендарным партызанскім камбрыгам Віктарам Іллічом Лівенцавым. Атрады яго 1-й Бабруйскай брыгады дзейнічалі ў Бабруйскім і Асіповіцкім раёне ў аддаленні якіх 40—50 кіламетраў ад Дражна, і, безумоўна, кабрыг ведаў пра трагедыю. Вось што ён у гэтай сувязі сказаў *(дыктафонны запіс — **В.Х.**)*:

Аўтар:

— Чаму не далі зорку Героя камбрыгу Іванову? Нічога на гэты конт не чулі?

Лівенцаў:

— Вельмі супярэчлівая фігура...

Аўтар:

—Кажуць, што гэта не адбылося таму, што калі Іваноў паехаў атрымліваць зорку Героя, то ў Маскве з сынам Панамарэнкі ўчыніў бойку?

Лівенцаў:

—Гэтага не можа быць! Калі ўжо матэрыялы пайшлі, то спыніць іх было немагчыма!..

*Па Іванову. Вы разумееце... У нас нават сярод камбрыгаў... Камандзіры атрадаў, якія былі з ім побач, — гэта Філіпскіх, Меркуль, Ціхаміраў Валодзя, яшчэ Каралеў — абвінавачваюць яго ў тым, што ён некалькі населеных пунктаў (паўза—**В.Х.**) — спаліў...*

І вось гэта зачэпка па Іванову, яна і сёння не дае спакою. Так нельга было паступаць. Гэта несправядліва.

Калі распачынаўся бой з гарнізонам, цяжка было выключыць загаранне якога-небудзь будынка. Абавязкова нешта загаралася. Але спецыяльна займацца гэтым — злачынна.

DRAZNO

Пасля вызвалення Беларусі ў ліпені 1944-га фронт пайшоў далей на захад, а з ім і многія з катаў дражненскай Хатыні. На тэрыторыі рэспублікі пачала працаваць камісія па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ці трапіла ў поле яе зроку дражненская трагедыя — невядома: у архівах Рэспублікі Беларусь дакументаў аб дзейнасці гэтай камісіі па Старадарожскаму раёну не маецца. Хутчэй за ўсё тая камісія прыняла б да ўвагі афіцыйныя партызанскія «дакументы», якія цытаваліся ці поўнасцю прыведзены ў гэтай кніжцы. Тлумачэнні і ўспаміны жыхароў «паліцэйскай» вёскі ніхто ніколі не патрабаваў ды і не прыняў бы да ведама. А дарэмна.

На сёння не адшуканы магілы героя-афіцэра і маладзенькага салдата, што загінулі ў Дражна пад восень 1941 года ад куль фашысцкіх паслугачоў.

З выхадам гэтай кніжкі можна лічыць афіцыйна адшуканымі прозвішчы 13 партызан, што загінулі ў баі 15.01.1943 года пры першым штурме вёскі Дражна. Хто тыя астатнія партызаны, што значацца пахаванымі ў брацкай магіле пад Дражна — пакуль невядома. Каб высветліць іх прозвішчы, патрэбны дадатковы пошук.

Невядома таксама, дзе пахаваны тыя дзевяць (?) партызан, што загінулі пры другім штурме вёскі 15.04.1943 года і прозвішчы якіх згадваліся у гэтай кнізе.



Напярэдадні 60-годдзя Перамогі пры ўваходзе на могілкі, дзе пакоіцца прах забітых партызанамі жыхароў Засценка, упершыню за дзесяткі гадоў з'явіўся вянок ад улады. Ён не ў памяць ахвяр трагедыі. Але жыхары вёскі палічылі і гэта добрай прыкметай — значыць сумленне не зусім страчана. Але ці ў ва ўсіх?

Аб гэтым — на наступнай старонцы.

САЙТ
«праваабарончай» арганізацыі «Хартыя-97»
у Інтэрнэце

http://www.charter97.org/rus/news/2003/11/25/kniga

НОВОСТИ
16:11, 25/11/2003
В Беларуси была издана книга о «еврейско-коммунистических партизанах»

Как сообщил корреспонденту Sem40 директор белорусского филиала организации «Объединение комитетов в защиту евреев бывшего СССР» Яков Басин недавно на прилавках минских магазинов появилась книга В.Хурсика «Кровь и пепел Дражно». Книжка издана на белорусском языке тиражом 150 экземпляров за счет средств автора.

Предметом повествования служит уничтожение партизанами сильного полицейского гарнизона в деревне Дражно Стародорожского района в апреле 1943 года силами нескольких партизанских отрядов, входивших во 2-ю Минскую бригаду. Во время боя погибло и несколько десятков мирных жителей.

Автор книги делает ответственными за их гибель евреев, якобы составлявших большинство в одном из штурмовавших деревню партизанских отрядов. Причем выводы эти В.Хурсик делает на основе слухов, распространявшихся... полицаями.

«Таким образом автор опирается на более чем сомнительные свидетельства» — подчеркнул Я.Басин. — Нет слов, война была жестокой, и есть достаточно материалов, в которых и действия партизан выглядят далеко не привлекательно. Писать об этом нужно — правда еще никогда не была во вред. Но писать нужно, лишь обладая необходимым набором фактов. А подобная «национальная» трактовка по сути продолжает линию нацистской пропаганды, твердившей о «еврейско-коммунистических партизанах».*

---

* *«Хартыя-97» не прынесла прабачэння аўтару і працягвае распаўсюджваць хлусню наконт таго, што кніжка напісана на «основе слухов, распространявшихся... полицаями».*

САЙТ

Міжнароднага яўрэйскага кангрэса

http://www.worldjewishcongress.org

АНТИСЕМИТИЗМ В БЕЛАРУСИ

Яков Басин,
Вице-президент,
Союз Белорусских Еврейских
общественных объединений и общин:

В большинстве изданий принижаются масштабы или даже полностью отрицается еврейское сопротивление на оккупированной территории. Появилась даже книга В.Хурсика «Кровь и пепел Дражно», в которой евреи обвиняются в геноциде мирного славянского населения. В книге описывается гибель в деревне Дражно 25 мирных жителей во время операции уничтожения еврейскими партизанами полицейского гарнизона. В качестве подтверждения того, что в этом «геноциде» виноваты евреи, автор приводит еврейское имя командира отряда и утверждает, что большинство партизан было евреями. Тут же в противоречие самому себе автор приводит список участников операции: из 109 партизан – 21 еврей.

Атрад імя Кутузава лічыцца яўрэйскім на падаставе архіўных дакументаў. Менавіта так вызначыў гэты атрад і акадэмік Іофе ў сваім артыкуле ў «Советской Белоруссии». Іофе меў рацыю: у атрадзе яўрэі складалі значную колькасць. Калі верыць паказанням сакратара Рудзенскага падпольнага міжрайкома партыі Глебава, частку атрада імя Кутузава складалі яўрэі з падазроным мінулым. Сярод яўрэяў на чале з Лапідусам Глебаў не выключыў наяўнасць нямецкага шпіёна. Ён не называе яго прозвішча. Можа таму, што прозвішча гэта належала не радавому?

Ранкам 14 красавіка 1943 года «каманда» Лапідуса (безумоўна, разам з партызанамі — прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў) удзельнічала ў забойстве мірных беларускіх грамадзян, у тым ліку і дзяцей. Гэты факт генацыда беларускага народа даказаны.

DRAZNO

У час той вайны д'ябл пераўтвараў чалавека ў пачвару незалежна ад полу, расы ці нацыянальнасці. Людзі катавалі адзін аднаго з садысцкай асалодай. Няма той нацыі, якая б не запляміла сябе чужой крывёй. Як вынікае з прыведзеных у гэтай кнізе дакументаў, яўрэі таксама не сталі выключэннем. Пры пэўных абставінах і яны забівалі безабаронных гэтак жа, як забівалі яўрэяў. Аднак, аўтар з-за гэтага не становіцца на шлях антысемітызму і не бэсціць дзяржаву Ізраіль.

Напярэдадні 60-годдзя Перамогі 27 красавіка 2005 года «Советская Белоруссія» надрукавала наступны ананімны артыкул (гл. стар. 102).

ГАЗЕТА

«Советская Белоруссия»

анонимная публикация в номере за 27 апреля 2005 года

...Хорошо. Но вот не так давно на свет появляется книга, в которой автор, «исследовавший» одну из боевых операций партизанской бригады на Минщине, требует... суда над народными мстителями. Потому что в ходе кровопролитнейшего боя по уничтожению полицейского гарнизона партизаны якобы расправились над местным населением! Мало того, что это фактическая ложь. Белорусские партизаны никогда и нигде не убивали детей. Это не эсэсовцы Кушеля и не каратели из Хатыни. Но, сочинив кощунственную книжонку, приведя в ней архивный список партизан отряда, который по замыслу провокаторов должен выглядеть как обвинительное заключение, автор ставит перед собой, очевидно, и более глобальную задачу — дискредитировать партизанское движение, поставить на одну доску советских патриотов и презренных гитлеровских палачей, подыграть тем, кто сегодня в Прибалтике моделирует новую реальность по отношению к итогам второй мировой войны. Дальше — больше. Нашлись и подзуженные гнусной книжонкой люди, которые обратились в Прокуратуру на предмет «возбуждения уголовного дела». Они захотели суда над партизанами в республике, которая во всем мире получила известность и уважение именно как партизанская республика! Прокуратура тем не менее скрупулезно проверила донос — «факты» не подтвердились... Но в таком случае встает вопрос, почему не понесли юридической ответственности те, кто в год 60-летия Великой Победы попытались раскрутить гнуснейшую фальшивку о «преступлении минских партизан против человечности?» Чего хотели добиться эти людишки? Чтобы советских партизан, живых и мертвых, усадили, видите ли, на скамью подсудимых, а в Минск в качестве праведных судей прибыли тени Гитлера, Гиммлера и Геббельса?

У цинизма нет границ.

У кнізе я не біў паклона ні Гітлеру, ні Гімлеру, ні Гебельсу. Адзіны паклон — забітым. Што ж тычыцца пракуратуры, то яе адказ сведку злачынства М.І. Пятроўскаму змешчаны на наступнай старонцы.

Пракуратура Рэспублікі Беларусь
Беларуская ваенная пракуратура

220034 Ф-2, г.МІНСК, вул. Азгура,4.
Тэл. (8-017)236-23-43 *14.11.2003 N23473*

Гр-ну Пятроўскаму М.І.
вул. Ілімская-17, кв.73,
220047, г. МІНСК

Паважаны Мікалай Іванавіч!

Беларускай ваеннай пракуратурай праведзена праверка таго, ці мелі адносіны партызаны атрада ім. Кутузава 2-й Мінскай партызанскай брыгады да знішчэння мірнага насельніцтва вёскі Дражна Старадарожскага раёна Мінскай вобласці пры правядзенні баявой аперацыі па ліквідацыі паліцэйскага гарнізона 14.04.1943 года. Выкладзеныя Вамі факты, роўна як і сведчанні апытаных у ходзе адпаведнай праверкі жыхароў указанай вёскі, не могуць служыць бясспрэчнымі доказамі дадзенай версіі і дастатковай падставай да ўзбуджэння крыміналь-най справы, паколькі спасылак і ўказанняў на канкрэтных асоб не маюць, заснаваны галоўным чынам на меркаван-нях, аповедах зараз памёрлых родзічаў і не стасуюцца з афіцыйнымі архіўнымі дакументамі аб баявой аперацыі партызанскіх атрадаў 2-й Мінскай партызанскай брыгады (у т.л. атрада ім. Кутузава) па знішчэнні паліцэйскага гарнізона ў в. Дражна 14.04.1943 года, якія не ўтрымліваюць якіх-небудзь дадзеных, што сведчаць аб дачыненні партызан да здзяйснення проціпраўных дзеянняў у адносінах да мірных жыхароў згаданага населенага пункта. У сувязі з тым, што прайшоў значны час з моманту разглядаемых падзей, атрымаць у ходзе праверкі звесткі, што дазвалялі б пацвердзіць ці абвергнуць выкладзеную ў заяве пазіцыю і з дакладнасцю
устанавіць факт наяўнасці альбо адсутнасці падзеі злачынства не прадставілася магчымым. Па выніках праверкі ў узбуджэнні крымінальнай справы адмоўлена на падставе п.1 ч. 1 арт. 29 КПК РБ за адсутнасцю грамадска небяспечнага дзеяння, што прадугледжана крымінальным законам.

Памочнік Беларускага ваеннага пракурора,
маёр юстыцыі А. Рудэнка. (Подпіс).

ДРАЖНА

Нават самы гераічны учынак нішто, калі насілле і смерць ягоны падмурак

Чалавек — істота надзвычай даверлівая. Праз уласную некрытычнасць яму даводзіцца часта перажываць шматлікія расчараванні і ўзрушэнні. Шчыра давярае ён і міфам, якімі афіцыйная гістарыяграфія імкнецца апісваць ці высвятляць тыя альбо іншыя перыяды мінуушчыны яго Бацькаўшчыны. Вядома, міфы самі па сабе не ўзнікаюць. Яны ствараюцца на замову пануючай ідэалогіі і ва ўгоду ёй. Айчынная гістарычная навука і па сёння замоўчвае, напрыклад, асобныя старонкі дзейнасці партызанаў на Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. У шматлікіх шматтомных манаграфіях, мемуарах, як і ў раманах, аповесцях, апавяданнях ды нарысах, вершах, яна, гэтая дзейнасць народных мсціўцаў, паказваецца выключна гераічнай. Не адмаўляючы партызанам у гераізме, прызнаючы іхнія вялікія заслугі ў дапамозе дзеючай арміі па разгроме гітлераўцаў, усе ж такі не трэба забывацца і на тое, што былі ў беларускай «партызанцы» і ганебныя старонкі, якія як самі ўдзельнікі, так і гісторыкі імкнуцца не згадваць. Замоўчваюць поўнасцю ці, у крайнім выпадку, падаюць у якасці надзвычай рэдкага выключэння. І следам стараюцца знайсці апраўданне той жорсткасці. Маўляў, а што было рабіць? У народных мсціўцаў не было іншага выйсця, як, напрыклад, забраць у сялянкі апошнюю карову ці парсюка альбо адабраць адзенне, харч... Вайна ж была!

Падобны падыход дужа падрывае не толькі саму гістарычную праўду, але і веру ў яе. А людзі, якія спакусіліся на танныя падробкі пад сапраўднае, асуджаюцца не толькі і не столькі на бяспамяцтва.

DRAZNO

Мінулае павінна вучыць. Якую карысць могуць прынесці скажоныя факты, сфальсіфікаваная гісторыя? Гісторыя прадстаўляе нам шанец атрымаць частку жыццёвага вопыту папярэднікаў. Вядома, у жыцці пратаптаных сцежак не існуе, але ісці наперад заўседы лягчэй і хутчэй, калі можна азірнуцца назад і адчуць падтрымку тых, хто такой дарогай ішоў ужо. Таму даследчык мінуўшчыны павінен быць адважным і бескампра-місным. Яму неабходна разумець важнасці кожнай гістарычнай крыніцы, кожнага сведчання не толькі як захавальніка мінулага, але і як носьбіта праўдзівасці. Прыкмета яго прафесіяналізму — уменне бачыць і ўраўнаважваць важныя падзеі і падзеі менш істотныя, быць аб'ектыўным і крытычным.

У сваей кнізе Віктар Хурсік пралівае святло на таямнічыя, трагічныя абставіны спалення вёскі Дражна, якая знаходзіцца на Старадарожчыне. У ёй ён звярнуўся і да артыкула гісторыка Эмануіла Іофе «Отряд из легенды», што быў змешчаны ў газеце «Советская Белоруссия» (№№287-288, 18лістапада 2000 года), у якім распавядалася пра дзейнасць партызанскага атрада імя Кутузава і гераічныя ўчынкі яго камандзіра І. Лапідуса. Праўда, прафесійны гісторык у гэтым артыкуле трагедыю спалення Дражненскага Засценка абмінуў... І тым самым стварыў міф. Канешне, той-сёй, прачытаўшы балючую кнігу Віктара Хурсіка, можа заўважыць, маўляў, падобнае дзікунства не з'яўляецца характэрнай асаблівасцю дзейнасці партызан. Гэта хутчэй адзінкавы факт, чым сістэма. На жаль, даводзіцца канстатаваць, што падобныя прыклады дзейнасці народных мсціўцаў адбываліся і ў іншых раёнах Беларусі.

...Першы панядзелак Вялікага посту жыхары Бялыніцкай вёскі Староселле называюць Сухім панядзелкам. У гэты дзень у весцы не праводзяцца аніякія ўрачыстасці, людзі не працуюць, перастае гучаць смех. Вяскоўцы сумуюць, памінаюць

трагічнае здарэнне спалення сваей вёскі. Як згадваюць старажылы, аніякай зачэпкі да карных дзеянняў партызанам вяскоўцы не давалі, жылі сабе ціха. Ды тая ціхмянасць не ўберагла іх ад бяды. Пад вечар, акурат у першы панядзелак Вялікага посту 1943 года, Стараселле зайшлося агнём. У многіх хатах ужо паклаліся спаць. І раптам вечаровую цішыню страсянула стаяніна, густая цемрадзь прарэзалася водсветам пажару. «Мае бацькі, — згадвае Зінаіда Фёдараўна Ходас,— толькі пабудавалі для сям'і новую хату. Перайшлі ў яе з зямлянкі. Нас літаральна сціснула ад жаху. Сядзелі, баючыся нават паварушыцца, на печы. На дварэ гарэлі суседскія сядзібы, і ў нашай хаце было так светла ад пажару, што хоць іголкі на падлозе збірай. Раптам бачым — адчыняюцца дзверы, і на парозе з'яўляецца нейкі мужчына са зброяй ў руках. Бацька меў каня. Ён стаяў у хляве. Але тата перад гэтым пайшоў у лес, каб схаваць вупраж, і на гэты страшны момант дахаты яшчэ не вярнуўся. Мужчына папярэдзіў маці: калі яна не адшукае хамут — расстраляе яе. Дома маці не змагла адшукаць вупраж, папрасілася схадзіць да суседзяў. І толькі ў трэцяй хаце, як высветлілася пазней, ёй паспачувалі і далі хамут, дугу, падсядзёлак, лейцы з вуздэчкай. Пабачыўшы ўзброенага дзядзьку, мы, дзеці, пачалі плакаць, узнялі гвалт. Але прыхадзень грозна цыкнуў на нас, стукнуў прыкладам аб падлогу.

Калі партызан выйшаў з хаты, то ўсе мы выбеглі на двор і кінуліся за вёску, на луг, дзе стаялі сцірты сена. У Стараселлі стаяла страшэнная страляніна, свісталі кулі, крычылі людзі. У гэтай мітусні было добра відаць, як прыхадні падпальвалі саламяныя стрэхі старасельскіх хат палаючымі факеламі.»

А вось успаміны аб трагедыі вёскі Аляксея Васільевіча Буйніцкага, якому тады ішоў шосты годзік: «Як пачалося ўсё гэта, бацька загадаў бегчы

да суседзяў. У іх быў пограб, і ў ім мы звычайна хаваліся. Калі выбег на вуліцу, убачыў паблізу падводу, ля якой стаялі некалькі мужчын. Яны стралялі па страсе нашае хаты трасіруючымі кулямі, і неўзабаве на маіх вачах хата ўзялася полымем». «Сташна было,—ўспамінае той вечар і Пётра Уладзіміравіч Семашкевіч. — Тых, хто без пярэчання аддаваў усё, што патрабавалі, нечапалі. Вось на адным падворку забіраюць карову. Гаспадару было загадана прынесці паболей сена. Ён моўчкі прынёс яго. А калі карову пачалі выводзіць з двара, гаспадыня з плачам кінулася да яе, абхапіла жывёліну за шыю. Тады прагучалі стрэлы. Забілі гаспадара і гаспадыню.» У Старасе́ллі ўцалела толькі некалькі хат. Жахлівую трагедыю давялося перажыць у жніўні 1943 года і жыхарам-стараверам яшчэ адной бялыніцкай вёскі Сялян-Клёўкі. Да слова сказаць, знаходзіцца яна ў якіх трох кіламетрах ад Старасе́лля. Напачатку жніўня, згадваюць вяскоўцы, паліцаі застрэлілі на вясковай вуліцы партызана. Стараверы труп апусцілі ў яму для захоўвання бульбы — спадзяваліся, што партызаны забяруць цела свайго таварыша. Яны неўзабаве і наведаліся ў Сялян-Клёўку. Бяздоказна абвінаваціўшы жыхароў у тым, што тыя нібыта выдалі партызана паліцэйскім, учынілі супраць вяскоўцаў карную акцыю: расстралялі 11 (па іншых звестках — 17) жыхароў гэтай вёскі, у тым ліку і некалькіх падлеткаў. Як сцвярджаюць відавочцы гібелі партызана, у ягонай смерці адыграў злавесную ролю збег абставін, нешчаслівы выпадак, яго ўласная неасцярожлівасць і неабачлівасць. Партызан знаходзіўся на вуліцы. Паліцэйскія акурат у той самы час ехалі на брычцы па дарозе паўз вёску. Заўважыўшы партызана, яны адкрылі па ім агонь і памчаліся далей. Партызаны з гэтага зрабілі сваю выснову. Да слова сказаць, названыя вышэй прыклады не удалося выявіць у дакументах партызанскай справаздачнасці. Дарэчы, самі

старасельцы, як і жыхары Сялян-Клёўкі не могуць дакладна сказаць (імі прыводзяцца толькі здагадкі, ускосныя доказы), байцы якіх партызанскіх атрадаў здзяйснялі гэтыя злачынствы. І ў гэтым няма нічога дзіўнага: абедзьве вёскі з'яўляюцца памежнымі — ад адной і другой рукой падаць да Бярэзінскага, а таксама і Крупскага раенаў. Цалкам дапушчальна, што чынілі гэты здзек і глум партызаны не Магілёўскай вобласці. Відаць, такія спосабы выявятлення адносінаў з мясцовым насельніцтвам, у тым ліку і крывавыя, для некаторых партызан і партызанскіх атрадаў з'яўлялася звычайнай справай. Звернемся да наступнага дакумента:

Доклады о боевой деятельности партизанских отрядов Могилевской области за апрель, май, июнь, июль, август м-цы 43 г. на совещании секретарей РКП(б)Б, командиров, комиссаров п/о 10.7.43 и 13.9.43 года. Сярод сямі пунктаў павесткі дня нарады, што праходзіла 10 ліпеня 1943 года ў штабе аператыўнай групы, быў і такі: *«Доклад о фактах неправильных взаимоотношений партизан с местным населением».* Пазнаёмімся з некаторымі такімі прыкладамі гэтага дакладу:

*29.9.43 партизаны из 61 п.о. тт. Маненок и Сидоров, пьяные, в д. Рубеж (Бялыніцкі раён — **М.К.**) произвели повальный обыск у крестьян, взрывали в квартирах полы, ломали двери, замки и т.д. Забирали у крестьян все, даже и детское бельё, не нужную для партизан женскую мануфактуру, куски простого ситца и т. д. В это время прибыли в деревню работники обкома, и задержанные партизаны даже не сознались в своих незаконных действиях и, только припертые фактами, сознались в своих злодеяниях. Командир 3 б-на 208 п.п. ст. лейтенант Стародубцев не только не вел борьбы с мародерством, а поощрял его. Окружил себя группой партизан и командиров, неоднократно занимавшихся мародерством, грабежем и избиением граждан (Абраев, Лобанов, Боцман, Ефимов, Рыбин и др.), мало того, Стародубцев отъявленного мародера Абраева*

DRAZNO

*назначил командиром разведки. Последний делом не занимается, а разъезжает по деревням, пьянствует, дебоширит и снабжает штаб батальона водкой. 19.9.43 в д. Куты ст. лейтенант Стародубцев организовал коллективную пьянку, после чего выстроил свой батальон и приказал: «окружить д. Ильинка (Магілёўскі раён — **М.К.**) и сжечь её, а население расстрелять». На выполнение этого гнусного приказа с охотой отозвался командир 5 роты Лобанович, и только по вмешательству политрука роты т. Иванина приказ не был выполнен. 20. 9. 43 командир взвода этого же батальона Стребков в д. Белявщина (Магілёўскі раён — **М.К.**), пьяный, расстрелял гр-на Дугенкова за то, что последний отказался дать ему мешок яблок. Об этом факте Стародубцев знал, но замазал его. Во время пребывания 3 б-на 208 п. п. за р. Друть зафиксирована масса фактов мародерства, граничащих с вооруженным бандитизмом. Кроме того 28.9.43 в д. Аксеньковичи (Бялыніцкі раён — **М.К.**) ст. лейтенант Стародубцев приказал продать корову за водку и организовал коллективную пьянку, после чего был организован дебош самим Стародубцевым, в результате которого был смертельно ранен секретарь партбюро полка т. Кузичкин. 2.10.43 т. Кузичкин умер...*

...7 октября Книга, будучи пьяный, взял с собой группу бойцов 40 человек и произвел провокационный акт в д. Гонча Кличевского района, мотивируя, что якобы жители д. Гонча антисоветские. Книга приказал партизанам произвести повальные обыски и забрать их имущество. Более того, сам Книга подходил к квартирам граждан, работающих на поле по уборке картофеля, простреливал из автомата замки, висящие на дверях домов, после чего разрешал хозяйничать в этих домах своей группе.

Вядома, за злачынствы трэба адказваць. Аднак у дадзеным выпадку пакаранне, якое вызначалася сумесным загадам Магілеўскіх сакратара абкама і камандзіра ваенна-аператыўнай групы, не суадносілася з учынкамі вінаватых. Мяркуйце самі.

ПРИКАЗЫВАЮ

1. Все выше поименованные аморальные факты немедленно устранить.

2. [...]

3. За организацию систематического пьянства в батальоне, замазывания случаев мародерства, некомандирское поведение среди своихподчиненных командира 3 батальона 208 п. п. ст. лейтенанта Стародубцева отстранить от занимаемой должности и назначить с понижением в должности в том же полку.

4. За систематические случаи пьянства, дебоши, за антисоветское поведение к гражданскому населению командира 278 п. п. Книга Н. И. снять с занимаемой должности и назначить с понижением в должности в 278 п.п.

Секретарь Могилевского подпольного обкома КП(б)Б полковник Мовчановский.

Командир военно-оперативной группы — подпол ковник Солдатенко.

Начальник штаба майор Георгиевский.

Такія пакаранні наўрад ці ўспрымаліся ўсур'ёз тымі, для каго яны прызначаліся.

Працытуем яшчэ адзін партызанскі дакумент.

DRAZNO

Приказ

по военно-оперативной группе при
Могилевском подпольном обкоме КП(б)Б
19 апреля 1944 г. № 038 Лагерь 277 п. п.

Содержание: Об укреплении воинской дисциплины и запрещении бесцельно-самовольной стрельбы.

Принятые размеры чрезвычайных происшествий и беспорядочной, самовольной, бесцельной стрельбы со стороны партизан не только рядового, но и командного состава партизанских отрядов, полков, приводят к постоянному тревожному напряжению раненых партизан и всеместное население. Все это в конце концов приводит к притуплению воинской бдительности и преступному расходованию боеприпасов и располагает личный состав партизанских отрядов к бессмысленным ненужным жертвам. Противнику зачастую удается небольшой группой вскочить в деревню, схватить живьем партизан и увезти с собой, а там, где хоть партизаны оказывают огневое сопротивление противнику, то на выстрелы никто не обращает внимания и на выручку, как правило, никто не идет. За последнее время особенно широко распространилась пьянка. Напиваются допьяна не только рядовой, но командно-политический состав. Пьянку, как правило, сопровождают стрельбой в помещениях, на улицах. Стреляют по партизанам и мирным жителям. Таким поведением партизаны переходят на прямой путь бандитизма.

11.4.44 в д. Селиба, Березинского района. группа бойцов Жуков, Бондарев и Шимко из десантной группы капитана Короткова взяли с поселка Лучной Мост гр-на Борисевича Петра, вывели его в лес и, произведя неоднократные выстрелы над головой, требовали корову, которую больше двух месяцев, как взяли партизаны.

...16. 4. 44 боец Атапин, десантной группы капитана Короткова, напившись до бесчувствия на вечеринке в д. Колбча, Кличевского района, из

автомата открыл стрельбу в потолок, а затем перенес по присутствующим гражданам, в результате убил гр-ку Еловик Елену, гр-на Измер Петра и ранил Трасевич Марию.

В ночь на 16 апреля 1944 г. группа партизан 13 п/полка в д. Засветичье, Капланецкого сельсовета, Березинского района, производила поголовные обыски и забирала все имущество, нужное и ненужное для партизан. Гр-ки Бурко Елизавета Павловна и Бурко Анастасия стали просить партизан, чтобы часть вещей оставили, командир группы Лялин приказал бойцу расстрелять гражданок, — боец в упор, прямо в лицо, расстрелял Бурко Елизавету и Бурко Анастасию — агентов 120 партизанского отряда, оставив сиротами семь малолетних детей.

Такім чынам, тое злачынства, пра якое распавёў краязнаўца Віктар Хурсік у сваей кнізе «Кроў і попел Дражна», — не адзінкавы прыклад. Узаемаадносіны народных мсціўцаў з мясцовым насельніцтвам, як вынікае, будаваліся нярэдка з пазіцыі сілы першых. А там, дзе правіць свой баль сіла, розуму, добрым пачуццям, звычайным чалавечым адносінам месца, зазвычай, няма. Ваенныя злачынствы тэрміну даўнасці не маюць. Канешне, многіх і многіх удзельнікаў партызанскіх карных акцый супраць мірнага насельніцтва сёння няма сярод жывых. Але такія ўчынкі, злачынствы іх павінны быць асуджаны хоць бы маральна, праз галоснасць. Надзвычай важна, каб прафесіяналы і аматары, якія даследуюць партызанскі супраціў фашыстам, ішлі ад праўды, асвятлялі як геройскія учынкі, так і ганебныя. У гэтым — зарука непаўтарэння падобнага, зарука маральнага ачышчэння і самаго грамадства. Прыгадваецца крылаты выраз: самы гераічны ўчынак нішто, калі насілле і смерць ягоны падмурак.

Варта памятаць пра гэта заўсёды і ўсім...

МіхасьКарпечанка *.

**Часопіс «Бялыніцкая даўніна», №4 за 2003 г.*

Аўтар прапануе ўзвесці ў вёсцы Дражна мемарыял у гонар усіх мірных жыхароў Беларусі, што загінулі ад куль партызан-бандытаў у гады другой сусветнай вайны

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Беларусі кожны мае права на сваю думку, на сваю ацэнку гістарычных падзей.

Гэтай кнігай аўтар нічога не сцвярджае. Ён выказаў сваю думку. Яна можа не супадаць як з меркаваннем тых людзей, якія прачытаюць гэту кнігу.

Аўтар заклікае не абвінавачваць людзей у забойствах на падставе недакладнасцяў на паперы (і нават на падставе паказанняў жывых сведкаў). Забойцам чалавека можа назваць выключна суд.

Аўтар лічыць: следства і суд па справе забойства мірных жыхароў вёскі Дражна Старадарожскага раёна 14 красавіка 1943 года магчымы і неабходны.

SUMMARI

The blood and ashes of Drazno

During the Second World War the Red Soviet Army due to the pressure of the german troops was forced to leave Belarus and with severe battles fell back to the east to Moscow. Belarus was occupied for long years. The population of the country splitted into 2 streams — thouse who with arms in their hands stood for the new masters — the Germans, and those men who fought against the occupants in guerilla troops. In the Russian and Belarusian historiography of the Second World War the facts that certain belarusians, who supported the occupants, committed outrages upon humanity are already known and declared to public. At the same time outrages of the Belarusian partisans are still not known. The tragedy of the village of Drazno is described in this book on the basis of historical records. This village was situated in Starodorozski district of Minsk region, and it was burned with the dwellers in april of 1943 by the jewish partisan brigade under the command of Israel Lapidus.

Das Dorf Drashno in Belarus (Weissrussland) wurde samt allen Einwohnern von sowjetischen Partisanen verbrannt, aber in einer offiziellen Militärstatistik wurden die verbrannten friedlichen Einwohner als Verbrecher und Banditen bezeichnet.

Auf Grund der Archivangaben habe ich diese Behauptung widerlegt und gezeigt, dass die jÎdische Partisanengruppe names Kutusow unter der Leitung des Gruppenkommandeurs Israel Lapidus friedliche weissrussische BÎrger vernichtet hat.

Літаратурна-мастацкае выданне

Хурсік Віктар Уладзіміравіч

Кроў і попел Дражна

Гісторыя партызанскага злачынства

Выданне другое, дапрацаванае і дапоўненае

Адказны за выпуск Віктар Хурсік

Рэдактар Вольга Хурсік
Карэктар Ірына Антонава

Падпісана ў друк 05.11.2005. Фармат 84x108 1/32.
Папера афсетная. Афсетны друк.
Улік.-выд.арк.4,0. Умоўн.-друк.арк.6,3.
Наклад 200 асобнікаў. Замова 220.


Выдавец Віктар Хурсік.
220117, г. Мінск, прасп. газ. "Звязда", 57—31.
Ліцэнзія ЛВ 02330/0133267 выдадзена 30.04.2004

Отпечатано в России
188676, Ленинградская обл., г.Всеволжск,
Всеволжский проспект, 114. МДМ Печать.

ISBN 985-6718-26-0

9 789856 718260

THE BLOOD AND ASHES OF DRAZNO



ISBN 985-6718-26-0

http://www.publisher-khursik.iatp.by
Усё пра выдаўца і яго кніжкі на сайце

The Byelorussian language

BELARUS, MINSK

The order and buying by:
E-mail: Khursik_Viktor@tut.by
tel. +375172703382
+375293818424